№ 24 (526) 29 чэрвеня 2007 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

# Дырэктарат супраць

Віцэ–прэм'ер Уладзімер Сямашка быў адзіным, хто пярэчыў Лукашэнку ў пытаньні адмены субсыдый прадпрыемствам.

У Беларусі дзяржаўная падтрымка будзе аказвацца толькі эфэктыўным прадпрыемствам і толькі пад акупныя праекты. Як паведамляе БЕЛТА, аб гэтым заявіў Аляксандар Лукашэнка 26 чэрвеня на нарадзе па пытаньнях дзяржаўнай падтрымкі рэальнаму сэктару эканомікі. «У прадпрыемстваў было больш за 10 гадоў, каб адаптавацца да новых умоў. Прадпрыемствы і калектывы, якія не змаглі гэта зрабіць, нам проста не патрэбныя», — заявіў А.Лукашэнка.

Няясна, ці гэта проста чарговыя пагрозы з мэтай заахвоціць стартныя прадпрыемствы працаваць лепей, ці падрыхтоўка да рэальнага скарачэньня бюджэтных выдаткаў. Апошнія гады ўсё абмяжоўвалася словамі.

Працяг на старонцы 2.

## Дэжа вю


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Купальле па-багатаму ў Мірскім замку адкрыла тыдзень грандыёзных сьвяткаваньняў. 3 ліпеня для жыхароў сталіцы на праспэкце Пераможцаў на адзін дзень заліюць лёд. Кожны зможа пад ліпеньскім сонцам пагуляць у хакей ці проста пакоўзацца. Сваімі марнатраўствамі сёлетнія сьвяткаваньні нагадваюць часы Караля Радзівіла, празванага Пане Каханку. Той уладальнік Нясьвіжу й Міру ў ліпені насыпаў дарогу з солі, каб ягоныя клієнты-шляхта маглі пакатацца на санях. Такімі спосабамі заваёўвалася папулярнасьць у XVIII стагодзьдзі. А вакол занепадала Рэч Паспалітая. Кіраўнічая кляса губляла патрыятызм, каб страціць сьледам і саму дзяржаву... На шчасьце, гісторыя не паўтараецца з дакладнасьцю.**

## У НУМАРЫ


### Імклівы рост запазычанасьці

Дэфолту не было, бо ўрад рэзка павялічыў замежную пазыку краіны. **Старонка 12.**

### БРСМ для дарослых

У пятніцу прайшоў установчы сход Менскага гарадзкога аб'яднаньня «Белая Русь». **Старонка 5.**

### Цыбуліны замест сабору

Новыя праекты ў Верхнім горадзе. **Старонка 8.**

КАМЭНТАР РЭДАКЦЫІ

## Праграма Каліноўскага, аб’ект ярасьці

Ніводнае пачынаньне апазыцыі не выклікала за апошні час такога раздражненьня, нават ярасьці ўладаў, як Праграма Каліноўскага. Даючы магчымасьць якаснага навучаньня за мяжой усім студэнтам, выключаным з унівэрсытэтаў, Праграма гарантуе актывістам нацыянальнага руху моцны імунітэт.

На гэтым тыдні да яе зноў прыцягнутая ўвага.

Па-першае, распачаўся другі набор на яе (**старонка 4**). Яе арганізатары зрабілі высновы з памылак мінулага году, і сёлета адбор шчыльнейшы, чым летась.

Па-другое, нейкая з спэцслужбаў напару з БТ арганізавала чарговы «скандал», скіраваны на дыскрэдатацыю Праграмы (**старонка 5**).

А як грамадзкая думка ацэньвае праграму пасьля году яе дзеяньня? Вынікі апытаньня на сайце nn.by: 70% ставяцца да Праграмы Каліноўскага пазытыўна. Гэта больш чым добры паказчык для «opportunity», даступнай ня ўсім. Грамадзтва бачыць у Праграме шанец вышкаліць эўрапейскага ўзроўню спэцыялістаў для будучай Беларусі.

ГОД ПАЭЗІІ

## Выпускнікам Ліцэю-2007

Піша Андрэй Хадановіч.

У Беларускім гуманітарным ліцэі чарговая выпускная вечарына. Уручэньне дыплёмаў і ўсякае такое сумна-сьвяточнае... Мне вельмі падабалася выкладаць літаратуру ў гэтай групе — на розных менскіх офісах-кватэрах. Для тых, хто ня ў курсе, Ліцэй быў забаронены ўладамі, але дагэтуль існуе ў падпольных умовах. У горадзе, за горадам... Так што два разы на тыдзень я езьдзіў туды электрычкаю. Забаўна, што з розных прычын навучальны год у Ліцэі пачынаўся ня 1 верасьня, як ва ўсіх незабароненых школьнікаў, а ў кастрычніку. Затое былі цудоўныя заняткі ўлетку ў Польшчы. Гданьск і мора згадваю з асаблівым замілаваньнем.

Карацей, дарагія ліцэісты, хай вам сёньня радасна сьвяткуецца! Не злоўжывайце алькаголем, і, можа стацца, сустрэнеце сьвітаньне ў бадзёрым рамантычным настроі.

Кожны віншуе сяброў, як можа. Адна зь нешматлікіх рэчаў, якія я ўмею ў жыцьці рабіць, гэта складаць у радкі словы й часам іх рыфмаваць. Вось жа, віншую, як магу.

* * *

**Не пераймайся, твая электрычка і сёньня прыйдзе:**
**дваццаць хвілін па веды з дачнікамі й бамжамі,**
**а потым — за тры пагоркі — будзе сядзіба ў прыгарадзе**
**і падпольныя словы, якія ты любіш вушамі.**

**Прывыкаеш да добрага — і не губляеш звычак,**
**хоць зададзена столькі, што прачытаць немагчыма.**
**Сьвятам першага верасьня будзе табе кастрычнік,**
**будзе расклад заняткаў — пад расклад электрычак,**
**і падпольныя людзі, якіх ты любіш вачыма.**

**А таму прачынаесься і разумееш, што ўсё не**
**так ужо і херова — дыхаць смачна і вольна!**
**Не пераймайся, твая электрычка прыйдзе і сёньня:**
**большасьць ведаў у гэтым жыцьці**
**ты атрымаеш падпольна.**

АПЫТАНЬНЕ НА САЙЦЕ NN.BY

### Пачаўся другі набор на Праграму Каліноўскага. А вы як думаеце, ад яе для Беларусі больш карысьці ці шкоды?

| | |
|---|---|
| карысьці: беларусы атрымаюць якасную адукацыю | 128 (43.1%) |
| шкоды: мала хто зь іх вернецца на бацькаўшчыну | 64 (21.5%) |
| карысьці: зьедуць слабыя | 25 (8.4%) |
| шкоды: цяпер баламуты–апазыцыянэры не баяцца выключэньня | 22 (7.4%) |
| ідэя добрая, але вучыць лепей ва Ўкраіне, каб меней спакусы застацца | 58 (19.5%) |

Усяго прагаласавала: 297



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Дырэктарат супраць

Працяг са старонкі 1.

Лукашэнка падкрэсьліў, што ўсе наяўныя сродкі павінны быць сканцэнтраваны на прарыўных напрамках, якія забясьпечваюць павышэньне канкурэнтаздольнасьці эканомікі.

Спэцыфічным тэрмінам «рэальны сэктар эканомікі» ў Беларусі акрэсьліваюць прамысловасьць і сельскую гаспадарку. Сфэру паслуг і навуковыя дасьледаваньні, доля якіх у сусьветным ВУП імкліва расьце, да «рэальнага сэктару» не адносяць. І ў прыярытэты іх ніколі не залічвалі. Беларускія ўрадоўцы дагэтуль застаюцца ў палоне савецкіх уяўленьняў пра эканоміку, паводле якіх ступень разьвіцьця краіны прама прапарцыйная маштабам прамысловай вытворчасьці, найперш — цяжкай прамысловасьці. Гэта было абумоўлена важнасьцю ВПК для дасягненьня галоўнай мэты савецкага рэжыму — сусьветнага панаваньня. Цяжка сказаць, ці адэкватны такі падыход нацыянальным інтарэсам Беларусі. Цяжкая прамысловасьць і сельская гаспадарка — энэргаёмістыя галіны. І зь іншага боку, геаграфічнае становішча Беларусі і адукацыйная інфраструктура натуральна спрыя-

юць пашырэньню сфэры паслуг (ад праграмаваньня да банкаўскай сфэры, ад транспарту да будаўніцтва).

Падтрымка прамысловасьці і сельскай гаспадаркі доўгія гады мела палітычную мэту: захаваць занятасьць на дзяржаўных прадпрыемствах і тым самым залежнасьць ад адміністрацыі, забясьпечыць падтрымку аўтарытарнай улады, прадэманстраваць яе перавагі перад дэмакратычнай і нацыянальнай альтэрнатывай. Але «ў прадпрыемстваў было больш за 10 гадоў, каб адаптавацца да новых умоваў. Прадпрыемствы і калектывы, якія не змаглі гэта зрабіць, нам проста не патрэбныя», — заявіў цяпер А.Лукашэнка. «Калі і абваліцеся — дзяржава ад гэтага не загіне, а раней, калі б усе абваліліся, то і дзяржава загінула б. Таму мы вымушаны былі праводзіць такую палітыку», — сказаў А.Лукашэнка.

Асабліва дасталося сельскай гаспадарцы і лёгкай прамысловасьці, дзе сытуацыя найгоршая.

«Я раблю адну выснову, што ўрад за кошт бюджэту спрабуе скрыць сваю нядатнасьць і дрэнную работу», — сказаў А.Лукашэнка.

Міхаіл Мясьніковіч, Зянон Ломаць і намесьнік кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта Леанід Анфімаў выступілі ва ўнісон з А.Лукашэнкам з крытыкай «асобных дзеяньняў ураду». «Мы ўзгадавалі цэлы клас утрыманцаў», — грымеў Анфімаў.

Пярэчыць наважыўся толькі віцэ-прэм’ер Уладзімер Сямашка. Ён выказаўся за працяг практыкі дзяржпадтрымкі. Ужо ня першы раз У.Сямашка выступае ў ролі выказьніка інтарэсаў дырэктарату. Гэтак, нядаўна ён выступіў за «павышэньне сацыяльнай абароненасьці кіраўнікоў прадпрыемстваў». Гэта значыць, за рост заробкаў, пэнсіяў, выгодаў для іх.

Сьмелыя, па лукашэнкаўскіх мерках, заявы У.Сямашкі адлюстроўваюць рост супярэчнасьцяў між дырэктаратам і ідэалягічна-сілавым апаратам рэжыму. Першаму хочацца павелічэньня ўласнай ролі ў працэсе капіталізацыі. Другі імкнецца да пабудовы дзяржаўнаманапалістычнага капіталізму.

**Мікола Бугай**

пытайцеся ў распаўсюднікаў новы нумар




ПАДПІСНЫ ІНДЭКС 00345

# Шляхам Вітаўта Мілінкевіча

21 чэрвеня, ва ўправе БНФ прайшлі першыя сумоўі для тых, хто хоча трапіць на вучобу ў Польшчу па праграме Каліноўскага.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Алег Воўчак (зьлева) — строгі экзамэнатар.**

Хлопцы і дзяўчаты прыехалі ў Менск з усіх гарадоў Беларусі. Многія з бацькамі — хто ж яшчэ падтрымае ў такую адказную хвіліну. Таты і мамы хвалююцца ня менш за сваіх дзяцей. Адзін бацька кажа: «Страшна адпускаць дачку ў сьвет, але выйсьця няма».

Адначасова зь першымі наведнікамі ў офісе партыі БНФ зьявілася нейкая бабулька-правакатарка, на дзіва абазнаная ў беларускай гісторыі: «Што, нашчадкі Каліноўскага сабраліся? Усе ў Польшчу ўцякаеце, а хто тут будзе?»

Вялікая заля ўправы была цалкам запоўненая «абітурыентамі». Відовішча вельмі падобнае да ўступнага іспыту ў ВНУ, калі яшчэ не ўвялі тэставаньня.

Гадзіна «Х». Выходзіць строгі «экзамэнатар» — праваабаронца Алег Воўчак. Ён называе прозьвішча — падскоквае адзін хлопец. Маці хлопца кажа: «Ну, з Богам». Маладзён ідзе ў кабінэт. Хвілінаў праз 7-10 выходзіць. Яго адразу абступаюць іншыя прэтэндэнты / канкурэнты: «Ну як? Паедзеш? Што пыталіся?» Хлопец сьмяецца: «Меней, чым ва ўнівэрсытэце на іспыце».

Алесь С. папрасіўся на прыём без чаргі, праз пару гадзінаў яму трэба здаваць экзамэн у мэдунівэрсытэце. Выходзіць амаль адразу і адмоўна махае рукой: «Ня возьмуць. Мяне ж ня выгналі з унівэру. Тым больш, кажуць, на мэдыцыну месцаў ня будзе». Зрэшты, Алесь ня вельмі і засмуціўся. Ён нічога не губляе, бо можа прадоўжыць вучобу на радзіме. Некаторыя ж дзяўчаты выходзілі з «экзамэнацыйнага» кабінэту са сьлязьмі на вачох. Тут лішнія пытаньні ня трэба — камісія паставіла «нездавальняюча».

У першы дзень ніхто не атрымаў адназначнага адказу, ці паедзе ён за мяжу. Кажуць, што будуць разьбірацца з кожным выпадкам асобна, бяруць нумар тэлефона і называюць прыкладную дату, калі можна чакаць тэлефанаваньня.

Чакаючы сваёй чаргі, дзяўчына расказвае, што яе выгналі з Акадэміі музыкі, нічога іншага, як сьпяваць, яна ня ўмее. Вось і хоча ў Польшчы працягнуць вучобу. Усіх пераконвае, што абавязкова вернецца: «Каму я ў той Польшчы патрэбная».

Бачачы знаёмыя твары, хлопцы і дзяўчаты пачынаюць сьмяяцца і жартаваць: «І ты ў польскі балаган захацеў? Шляхамі Вітаўта Мілінкевіча пойдзем?» Расказваюць адзін аднаму пра затрыманьні і арышты,ператрусы і допыты. Хвалююцца, ці змогуць вывучыць польскую. Чамусьці мала хто гаворыць па-беларуску.

Заходжу паглядзець, што адбываецца ў «экзамэнацыйным пакоі». У камісіі сямёра чалавек. Выклікаюць «абітурыента». Заходзіць сымпатычная дзяўчына з Паставаў Алеся Р. Пытаюцца, хто такая, адкуль, як удзельнічае ў палітычным жыцьці, ці былі нейкія рэпрэсіі. Адказвае, што не было, але з працы звольнілі яе бацьку, пастаўскага дэмакратычнага актывіста. Праграма Каліноўскага разьлічана і на дзяцей, у якіх рэпрэсаванымі аказаліся бацькі. Зрэшты, у дзяўчыны не аказалася патрэбных дакумэнтаў, каб гэта пацьвердзіць. У камісіі просяць прывезьці ўсе патрэбныя паперы, а ўжо потым будзе весьціся гаворка пра вучобу.

Дзяўчына з Баранавіч пераконвае, што праз яе палітычную актыўнасьць яна ня можа паступіць ва ўнівэрсытэт. Пытаюцца, а ці былі супраць яе прымененыя нейкія палітычныя рэпрэсіі. Кажа, што не. Таму і шанцы зьехаць у яе малыя.

Вынікае, сёлета трапіць на праграму Каліноўскага зможа далёка ня кожны. Адбор стаў нашмат больш строгі, чым летась. Сёлета ў фонд абароны рэпрэсаваных «Салідарнасьць» было пададзена каля 60 заявак на працяг вучобы за мяжой. Колькі зь іх задаволяць, а колькім адмовяць, стане вядома ў пачатку ліпеня.

Экзамэнацыйная кампанія працягваецца.

**Зьміцер Панкавец**

# БРСМ для дарослых

У пятніцу ў сталіцы прайшоў устаноўчы сход Менскага гарадзкога грамадзкага аб'яднаньня «Белая Русь».

Напярэдадні сходу яго ініцыятары зьвярнуліся да жыхароў гораду з заклікам «аб’яднаць намаганьні для падтрымкі курсу, які праводзіць дзяржава, для абароны нашых грамадзян ад разбуральнага ўзьдзеяньня «добразычліўцаў звонку», спалучэньня вопыту і ведаў старэйшага пакаленьня, сілы і магчымасьцяў маладога». «Стварыўшы Менскае грамадзкае аб’яднаньне «Белая Русь», мы яшчэ больш аб’яднаем нашы магчымасьці і памкненьні да абароны нашай Радзімы, да яе разьвіцьця, умацаваньня і ўдасканальваньня». (Усё гэта цытаты зь «Звязды».)



ЗЬМІЦЕР БРУШКО

Сярод ініцыятараў стварэньня гарадзкой арганізацыі — вядучы тэлепраграм АНТ Аляксандар Аверкаў, дырэктар Тэатру музкамэдыі сьпявак Аляксей Ісаеў, аўтар словаў гімну Ўладзімер Карызна, дэпутат палаты прадстаўнікоў вэртыкальніца Ірына Аляксанава, трохразовы чэмпіён Алімпійскіх гульняў Аляксандар Мядзьведзь.

Аналягічныя сходы прайшлі ў многіх іншых гарадах краіны пад шчыльным кантролем чыноўнікаў з ідэалягічнай вэртыкалі.

Журналістаў Зьмітра Брушка, Кірылу Жываловіча і Андрэя Александровіча не пусьцілі ў памяшканьне Дзяржаўнага музычнага тэатру, дзе адбываўся сход. Са словаў З.Брушка, ім адмовілі на той падставе, што журналісты ня мелі акрэдытацыі. «Там прысутнічала ледзьве ня ўсё чынавенства з ідэалягічнага аддзелу Менгарвыканкаму», — кажа журналіст «Белгазеты». Ён кажа, што хтосьці з чыноўнікаў і выклікаў міліцыянтаў.

Супрацоўнікі міліцыі выклікалі дадатковую машыну, каб адвезьці затрыманых у РУУС, аднак пачуўшы, што тыя тэлефануюць калегам, адмовіліся ад сваіх намераў.

Сходы па стварэньні аб’яднаньня «Белая Русь» прайшлі ва ўсіх рэгёнах краіны. Скрозь іх арганізацыяй займаюцца дзяржаўныя чыноўнікі з упраўленьняў ідэалёгіі. Многія назіральнікі выказваюць ідэю, што «Белая Русь» стане квазі-партыяй А.Лукашэнкі. Аналягам БРСМ, толькі для дарослых.

**Сямён Печанко**

### Гісторыя «Белай Русі»

Аб’яднаньне было створанае ў 2004 годзе на Гарадзеншчыне. Ягоным ініцыятарам стаў рэктар Аграрнага ўнівэрсытэту Горадні і адначасова дэпутат савету рэспублікі (прызначанай палаты) Вітаўт Песьціс. У траўні 2007–га аб’яднаньне рэзка актывізавалася і ягоныя аддзяленьні сталі расьці ва ўсёй краіне, як грыбы. На сёньня, паводле словаў Песьціса, яно налічвае 12 тыс. чалавек.

### Мясьніковіч шкадуе, што няма КПСС

«Не Белавескія пагадненьні ляжаць у аснове распаду СССР і не вайскова–прамысловы комплекс, які забіраў асноўныя сродкі. Асноўная прычына ў тым, што з Канстытуцыі быў вымараны артыкул пра кіроўную ролю КПСС, — заявіў кіраўнік Акадэміі навук Міхаіл Мясьніковіч, выступаючы на міжнароднай канфэрэнцыі, прысьвечанай 15–годзьдзю Эканамічнага суду СНД. На ягоную думку, разам з гэтым артыкулам зьнік «стрыжань грамадзтва». «Сёньня Кітай пры наяўнасьці кампартыі разьвіваецца і ўсім дэманструе свае посьпехі», — дадаў ён.

# Правакацыя БТ і спэцслужбаў

«У чатырох актывістаў радыкальнай беларускай апазыцыі, якія навучаюцца ў Польшчы, на мытні былі адабраныя два ноўтбукі з электроннымі дапаможнікамі па тэрарызьме», — паведаміў Першы канал 24 чэрвеня.

Справа выглядала падазрона хоць бы таму, што вынікла адразу пасьля пазбаўленьня Беларусі гандлёвых прэфэрэнцый ЭС. Як высьветлілася, у чатырох юнакоў сапраўды канфіскавалі ноўтбукі. Толькі было гэта... чатыры месяцы таму. Працягу справа ня мела, аднак і кампутары дагэтуль не вярнулі, нягледзячы на пэрыядычныя скаргі.

Сярод тых чатырох былі прэсавы сакратар «Маладога фронту» Барыс Гарэцкі і гарадзенец Яўген Скрабутан. Апошні набыў вядомасьць пасьля таго, як яго выключылі з унівэрсытэту за графіці «Спыніць русіфікацыю».

Сам Гарэцкі на днях вылецеў у Страсбург, каб узяць удзел у сэсіі Парлямэнцкай асамблеі Рады Эўропы. «Мо хтосьці тыя ноўтбукі папросту прысабечыў, а цяпер ня хоча аддаваць?» — кажуць юнакі.

Барыс Гарэцкі належыць да хрысьціянскае плыні МФ і адкідае гвалтоўныя мэтады палітычнай барацьбы.

Праваабаронцы адзначаюць, што спробы адстаяць свой гонар і годнасьць у дачыненьні БТ ніколі ня мелі посьпеху.

**МБ**

# На пытаньне пра Чыжа Міклашэвіч пасьміхнуўся

Пра кіраўніка «Белнафтахіму» Бароўскага ён паведаміў, што ў справе «яшчэ пяць–шэсьць фігурантаў».

Генэральны пракурор Беларусі Пятро Міклашэвіч (**на фота**) даў прэс-канфэрэнцыю з нагоды 85-годзьдзя пракуратуры, якое адзначаецца 26 чэрвеня.

На ёй генпракурор паведаміў, што ў дачыненьні да былога кіраўніка «Белнафтахіму» Аляксандра Бароўскага заведзеныя ў суме тры крымінальныя справы: па артыкуле 210 «Крадзеж шляхам злоўжываньня займаемай пасадай» і 424 «Злоўжываньне службовымі паўнамоцтвамі». Апроч гэтага, вядзецца сьледзтва па артыкуле 375 «Разгалошваньне службовай таямніцы». Паводле словаў пракурора, крадзяжы былі ўчынены Бароўскім падчас закупкі й рэалізацыі нафтапрадуктаў.

Апроч Бароўскага, у справе яшчэ пяць-шэсьць фігурантаў, прозьвішчы якіх Міклашэвіч назваць адмовіўся, толькі дадаў, што гэта прадстаўнікі «Белнафтахіму» і кіраўнікі іншых камэрцыйных арганізацый.

На пытаньне, ці праходзіць па гэтай справе дырэктар фірмы «Трайпл» Юры Чыж, Міклашэвіч заўсьміхаўся і паўтарыў, што ў інтарэсах сьледзтва прозьвішчы пакуль называць ня будзе.

Генпракурор пацьвердзіў, што 31 траўня пракуратура завяла крымінальную справу на двух палкоўнікаў КДБ і палкоўніка МУС. Іх вінавацяць у атрыманьні хабару ў асабліва вялікіх памерах.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

У справе затрыманага два тыдні таму ў Маскве былога намесьніка Васіля Лявонава ў калгасе «Рассвет» Мікалая Гецмана генпракурор паведаміў, што ідзе працэс ягонай экстрадыцыі. Але справа ўскладняецца тым, што Гецман хоча прыняць расейскае грамадзянства.

Паводле словаў Пятра Міклашэвіча, у ліпені скончыцца сьледзтва па справе наконт карупцыі на пераходзе «Заходні Буг» і гарадзенскай мытні. Перад судом паўстануць 22 чалавекі, сярод іх — 9 мытнікаў. Іх абвінавачваюць у незаконным увозе ў краіну буйных партый кампутарнай і побытавай тэхнікі ды мяса.

Празь нейкі час перададуць у суд яшчэ адну крымінальную справу супраць мытнікаў. 25 чалавек вінавацяць ва ўчыненьні шкоды дзяржаве на 90 млрд. рублёў.

«Мы маем справу з сапраўднымі злачыннымі арганізацыямі на мытні», — зазначыў Міклашэвіч.

Летась былі заведзеныя 797 крымінальных справаў па факце хабару, 464 — крадзяжу з выкарыстаньнем службовых паўнамоцтваў, 316 — злоўжываньня службовымі паўнамоцтвамі. Гэта на 18,1% менш, чым пазалетась.

Акрамя таго, генпракурор паведаміў, што Камітэтам дзяржбясьпекі ўсчатая крымінальная справа па факце гібелі ў Самалі беларускіх самалётаў. Аднак істотных зрухаў у ёй пакуль няма.

У цэлым жа, па словах Пятра Міклашэвіча, генэральная пракуратура ў сваёй дзейнасьці кіруецца лёзунгам Лукашэнкі «Ў нас няма недатыкальных».

**Зьміцер Панкавец**

### Падарункі ў чыноўнікаў будуць забіраць у прыбытак дзяржавы

27 чэрвеня палата прадстаўнікоў прыняла законапраект аб унясеньні папраўак у некаторыя законы па пытаньнях дзяржаўнай службы. Там, у прыватнасьці, гаворыцца, што «дзяржаўны службоўца не мае права прымаць маёмасьць (падарункі) або іншую выгаду ў выглядзе паслугі ў сувязі з выкананьнем службовых абавязкаў, за выключэньнем сувэніраў, якія ўручаюцца пры правядзеньні пратакольных і іншых афіцыйных мерапрыемстваў».

Сувэніры, кошт якіх перавышае 5 базавых велічынь (155 тыс. рублёў), перадаюцца ў прыбытак дзяржавы па рашэньні камісіі, створанай кіраўніком дзяржаўнага органу.

# Газіёпа наступае

Яе зброя — трубы і ракеты. Камэнтар **Аляксандра Класоўскага.**

Маскоўскае выданьне «Газета» трыюмфуе. У публікацыі з двухсэнсоўнай назвай «Газіёпа» (але выразным падзагалоўкам «Новы ўсясьветны энэргетычны парадак па-расейску») выданьне абмалёўвае сапраўды ўражальную панараму газанафтавага наступу Крамля на Стары Сьвет. Якія ж на гэтым тле пэрспэктывы Беларусі?

У мінулую суботу «Газпром» падпісаў маштабную дамову з італьянскай кампаніяй «Эні». Газаправод «Паўднёвая плынь», акрамя ўсяго іншага, можа стаць альтэрнатывай праекту «Набука», які меў на мэце пампаваць на захад блакітнае паліва з Ірану ды Цэнтральнай Азіі.

Карацей, Масква адсякае канкурэнтаў. А таксама купляе энэргетычнымі пернікамі ляяльнасьць бедных краінаў Паўднёва-Ўсходняй Эўропы. У мінулую нядзелю Пуцін асабіста наведаў дзеля гэтага Балканскі энэргетычны саміт у Заграбе. Як піша тая ж «Газета», «Масква знайшла самае слабое месца ў абароне Эўразьвязу. У балканскі прарыў кінуты ўвесь расейскі ТЭК».

На тле гэтай сапраўды маштабнай панарамы энэргетычных манэўраў асабліва выразна бачна, што Беларусь ня ёсьць нейкім транзытным пупом зямлі, як здавалася асобным тутэйшым стратэгам.

І Паўночнаэўрапейскі газаправод, і БТС-2, і цяпер вось «Паўднёвая плынь» аб’ектыўна абясцэньваюць транзытныя козыры Беларусі. «Независимая газета» наўпрост кажа пра «новую пугу для Кіева і Менску».

# Нашых кандыдатаў няма




Ніхто зь беларусаў ня вылучаны на Нобэлеўскую прэмію міру сёлета.

Паводле нашай інфармацыі з крыніцаў у Нарвэгіі, ніводзін беларус ня быў намінаваны сёлета на Нобэлеўскую прэмію міру.

Летась у сьпісе намінантаў быў праваабаронца Алесь Бяляцкі. Ён разглядаўся як адзін з самых імаверных кандыдатаў.

Вылучэньне сканчваецца ў лютым, і сьпісы кандыдатаў застаюцца ў таямніцы. Аднак пэўна, што прынамсі сярод нарвэгаў беларусаў сёлета ніхто не вылучаў.

Летась кандыдатуру Алеся Бяляцкага прапанавала група дэпутатаў нарвэскага парлямэнту ад розных партыяў. Гэтую ідэю лабіравалі праваабаронцы з Швэцыі й Нарвэгіі.

Выбар ляўрэата ажыцьцяўляе камітэт у складзе пяці чалавек, якія дэлегуюцца рознымі партыйнымі фракцыямі парлямэнту. Да гэтага пытаньня нарвэжцы ставяцца як да справы нацыянальнага гонару.

Прэмію ў свой час атрымалі Нэльсан Мандэла — лідэр руху барацьбы з апартэідам, Андрэй Сахараў (1975) — самы вядомы з савецкіх дысыдэнтаў, Лех Валэнса (1983) — лідэр польскай «Салідарнасьці», кіраўніца бірманскай апазыцыі Су Джы ці яшчэ кіраўнікі вызваленчага руху Ўсходняга Тымару. Камусьці зь іх гэтае найвышэйшае сусьветнае прызнаньне дапамагло захаваць свабоду, камусьці — нават жыцьцё. Яшчэ дзесьці гэта дапамагло ўнікнуць крыві — галоўная задача прэміі.

Дагэтуль ніводзін беларус не атрымліваў прэстыжнай узнагароды. Ураджэнцы Беларусі — Ахарон Клуг (хімія), Сайман Сьміт Кузьнец (эканоміка), Жарэс Алфёраў (фізыка), Мэнахем Бэгін і Шымон Пэрэс (мір) — але не грамадзяне краіны.


УЛАДЗІМЕР ШЛАПАК

У свой час Сяргей Дубавец пісаў, што атрыманьне Нобэлеўскай прэміі было б важным для ўмацаваньня нацыянальнага гонару беларусаў.

Аднак пасьлядоўна лабіраваньнем беларускіх кандыдатураў на Нобэля не займаецца ніхто: ні ва ўрадзе, ні ў незалежным грамадзтве.

**Мікола Бугай, Осла**

## СЬЦІСЛА

### Лукашэнка сустрэўся з галяндцамі

Банк «ABN Amro» (Нідэрлянды) зацікаўлены ў доўгатэрміновай супрацы зь Беларусьсю. Пра гэта было заяўлена 21 чэрвеня падчас сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі з кіраўніцтвам банку.

Член праўленьня «ABN Amro» Вілка Джыскат зазначыў, што банк выбудоўвае ў Беларусі канцэпцыю супрацоўніцтва на доўгатэрміновай аснове. Паліўна-энэргетычны комплекс разглядаецца «ABN Amro» ў якасьці прыярытэтнай сфэры для інвэставаньня.

### Выбары пройдуць 12 кастрычніка 2008 году

Цэнтравыбаркам лічыць 12 кастрычніка 2008 году аптымальнай датай для правядзеньня выбараў дэпутатаў палаты прадстаўнікоў. Пра гэта заявіў сакратар выбаркаму Мікалай Лазавік.

### Беларуская мова стане афіцыйнай на тэрыторыі ЭС

У гарадзкой управе гораду Гайнаўка, што на Беласточчыне, у хуткім часе можна будзе вырашаць усе пытаньні, карыстаючыся беларускай мовай. Адпаведную ўхвалу на ўнёсак Беларуска-Народнай фракцыі прыняла гарадзкая Рада. 27% жыхароў Гайнаўкі лічаць сябе беларусамі. Права карыстацца роднай мовай (у якасьці «дапаможнай мовы» ў дзяржаўных установах) дае ім адпаведны закон, прыняты ў 2005 годзе.

Рашэньне Рады яшчэ мусіць зацьвердзіць МУС Польшчы.

### Саюз левых партый: дубль два

Партыйная апазыцыя гатовая гуляць па правілах уладаў: у найбліжэйшы час плянуецца зладзіць паўторную ўстаноўчую канфэрэнцыю Саюзу левых партый (СЛП). Пра гэта паведаміў выконваючы абавязкі старшыні Грамады Анатоль Ляўковіч.

У лютым Міністэрства юстыцыі адмовіла СЛП у рэгістрацыі, спасылаючыся на тое, што паводле заканадаўства палітычныя партыі ня маюць права арганізоўваць мерапрыемствы на тэрыторыі іншых дзяржаў. Між тым праз немагчымасьць знайсьці памяшканьне зьезд праводзілі ў Чарнігаве.

### Мілінкевіч едзе па краіне

Аляксандр Мілінкевіч распачаў чарговую сэрыю паездак па рэгіёнах Беларусі. «Стварэньне разгалінаванай сеткі народнага Руху «За Свабоду» стане галоўнай мэтай паездак», — паведамляе сайт палітыка.

**МБ;
з выкарыстаньнем інф. «Хартыя'97», радыё «Свабода»**

# Цыбуліны замест сабору

Новыя праекты будаўніцтва ў Верхнім горадзе: на месцы рэнэсанснага сабору будзе капліца ва ўладзімера-суздальскім стылі, а на месцы Малога Гасьцінага двара — фантан.

Фальшаваньне старога Менску скора будзе скончана. Ва ўнітарным прадпрыемстве «Менскпраект», якое ёсьць фактычна манапалістам на праектныя работы на Верхнім горадзе, гэтымі днямі даводзяць да прэзэнтацыі чарговы праект.

Без агалоскі дапрацоўваецца дакумэнтацыя на два аб'екты. На месцы, дзе стаяў рэнэсансавы сабор Сьвятога Духа, узарваны камуністамі ў 1937 годзе, цяпер для Маскоўскага Патрыярхату пабудуюць капліцу (вышыня 6 м). Проста на старажытных падмурках, не зважаючы на культурны слой. Вызначанае месца — прыкладна за падмуркамі былога галоўнага фасаду сабору, углыб галоўнай навы на 2 метры.

Усё гэта, атрымліваецца, дзеля таго, каб РПЦ застаўпіла тэрыторыю, каб ніхто там нічога не плянаваў адбудоўваць.

А на месцы былога будынка малога гасцінага двара (пл.Свабоды, 19-21) (праваруч ад галоўнага фасаду цяперашняга праваслаўнага будзе... басэйн з фантанам. Старшыня гарвыканкаму Міхаіл Паўлаў ужо падпісаў гэтыя праекты.

Беларуская рэспубліканская навукова-метадычная рада па пытаньнях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры чарговы раз ухваліла чарговы акт вандалізму.

Хоць, у адпаведнасьці з пастановай Савету Міністраў ад 12 кастрычніка 2004 г. №1271 «Пра зацьверджаньне Комплекснай праграмы рэканструкцыі, рэстаўрацыі, аднаўленьня і добраўпарадкаваньня гістарычнага цэнтру г.Менску на 2004—2010 гады» гарвыканкам унёс абодва гэтыя аб'екты ў Сьпіс гісторыка-культурнай спадчыны ў межах гістарычнага цэнтру. Самі прынялі, самі парушым...

Калі праекты рэалізуюцца, стары горад стане яшчэ менш падобны да таго, якім ён быў. Зьмяншаюцца шанцы на аднаўленьне Верхняга гораду ў цэласьці — квартала шчыльнай барочнай забудовы. Бяз гэтага genius loci, дух месца старога Менску, траціцца незваротна. Замест гэтага крок за крокам Верхні горад насычаецца расейскімі архітэктурнымі элемэнтамі, якіх ён гістарычна ня ведаў.

**Сяргей Харэўскі**

# Пінск спрастуюць

У цэнтры гораду зьнясуць тузін дамоў і Першамайская стане ідэальна простай.



Генплян разьвіцьця Пінску прадугледжвае радыкальныя зьмены ў цэнтры гораду.

Плянуецца знос двух жылых дамоў на вуліцы Завальнай і цэлага дзясятка на правым баку Першамайскай на кавалку ад рэстарану «Зара» да будынку Нацбанку. На вызваленай тэрыторыі аўтадарога злучыць вуліцы Першамайскую і Бялова.

Такім чынам выезд на мост церазь Піну ў гістарычнай частцы гораду будзе магчымы без «затораў» і паваротаў. Адміністрацыя ўжо пачала паэтапнае адсяленьне жыхароў. Некаторыя зь іх зьнікнуць з мапы Пінску ўжо да канца бягучага году.

Заснаваны не пазьней за 1097 год Пінск — адзін з найстарэйшых гарадоў краіны. Ён таксама адзін з самых захаваных: ваенныя дзеяньні мінулі яго бокам, а саветы ўзарвалі ў ім толькі езуіцкі сабор.

## Разьвітаньне з старой пляніроўкай

Пры зносе дамоў і спрамленьні вуліцаў страціцца непаўторная прастора старога Пінску, які фармаваўся стагодзьдзямі і адлюстроўваў палескі ляндшафт. Пінскія архітэктары, як і гарадзенскія, забываюцца, што цуд старасьвеччыны ствараюць не асобныя будынкі, а іх ансамблі. У незвычайнасьці — хараство. І ў цэльнасьці. Трацячы цэльнасьць, старыя гарады ператвараюцца ў асобныя старыя дамы, упісаныя ў новыя мікраraёны. Зрэшты, упартыя перабудовы што ў Горадні, што ў Пінску могуць робіцца сьвядома. Старыя гарады натхнялі нацыянальны дух. Разбураючы старыя кварталы, ідэолягі дабіваюцца, каб яны не пераўзыходзілі ў свфэрыяду.

# Гарадзенская фартэцыя

30 чэрвеня ў Горадні паўстане намётавае мястэчка.

Ад 30 чэрвеня ў прыгарадзе Горадні распачынаецца летнік. Удзень жыхары лягеру будуць несьці вахту ў Старым горадзе, увечары бавіць час ля вогнішча пад сьпевы бардаў.

Летнік «Гарадзенская фартэцыя» паўстане непадалёку ад гораду, не беразе Нёману. Гэта будзе намётавае мястэчка, распавёў актывіст кампаніі «Выратуем Горадню» Алесь Залеўскі. Назву падказаў пісьменьнік Уладзімер Арлоў. Удзень жыхары лягеру будуць несьці вахту ў горадзе побач з будынкамі, заплянаванымі пад знос, раздаваць інфармацыйныя матэрыялы, прысьвечаныя праблеме рэканструкцыі Горадні. Увечары іх чакае культурная праграма: сьпевы бардаў і многае іншае. Свой удзел ужо пацьвердзілі Таццяна Беланогая і гурт «Джамбібум».

Распачнецца летнік 30 чэрвеня, у дзень, калі гарадзенцы адзначаюць Купальле. Залеўскі разьлічвае, што летнік зьбярэ ня менш за паўсотні маладзёнаў.

**Сямён Печанко**




## Брукаванку 1938 году мяняюць на плітку

Адзіная пешаходная вуліца Горадні, Савецкая, зачыненая. Вядзецца плянавая замена бардзюраў і старой пліткі на ходніках. Яе плянуюць выкарыстаць на іншых вуліцах, а Савецкую закласьці новай пліткай і мармуровымі бардзюрамі.

Краязнаўца Ігар Лапеха ня бачыць патрэбы мяняць трывалы брук і бардзюры 1938 г. «Ізноў з гарадзенцамі не параіліся! — абураецца ён. — Які трэба мець густ, каб прыняць такое рашэньне? Няма пачуцьця гаспадара ў іх».

**СП**

## Невядомая Горадня з гравюры Макоўскага

У 80-я XX ст. у Стакгольме быў знойдзены адбітак гравюры тапографа і мастака зь Нясьвіжу Тамаша Макоўскага. На ім — Старая Горадня зь левага берага Нёмну. Даступная раней копія была пазбаўленая паловы — амаль усёй масавай забудовы гораду.

Гравюра (**зьверху**) раскрывае эстэтычныя асаблівасьці найважнейшага этапу фарміраваньня горада, калі вызначыліся элемэнты яго кампазыцыі, іх сувязі з тапаграфіяй ляндшафту, што істотна для рэгенэрацыі гістарычнай забудовы Горадні, якая застаецца паранейшаму актуальнай.

**Паводле часопісу «Мастацтва»**

## Круглы стол па вострых праблемах

Нягледзячы на запалохваньні, на ім прысутнічалі выкладчыкі гарадзенскіх унівэрсытэтаў.

20 чэрвеня ў Горадні быў круглы стол «Каму выгадна разбураць Горадню?».

Арганізатарамі выступілі аргкамітэты кампаніі «Выратуем Горадню», Руху «За Свабоду!», ТБМ.

У дыскусіі ўдзельнічалі выкладчыкі ўнівэрсытэтаў.Намесьнік прарэктара па выхаваўчай працы Гарадзенскага ўнівэрсытэту Таццяна Бадзюкова папярэдзіла кожнага запрошанага, што яго прысутнасьць недапушчальная», — патлумачыў адсутнасьць часткі запрошаных актывіст Алесь Залеўскі.

Аляксандар Мілінкевіч, які таксама прысутнічаў на паседжаньні, лічыць, што гэтая справа палітычная. Праблема ў спосабе фармаваньня ўлады, якая не абіраецца, а прызначаецца зьверху, таму й не кантралюецца народам, лічыць палітык.

Удзельнікі абмеркаваньня высунулі шэраг прапаноў, сярод якіх — адбудова страчаных гарадзенскіх помнікаў, у тым ліку і Фары Вітаўта, разбуранай у 1961 г.

**СП**

# Непісаная Канстытуцыя

Пакуль існуе Расея ў сваім цяперашнім выглядзе, пагрозы распаду Эўрасаюзу няма. Піша **Віталь Тарас**.

«Малая Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь» была апублікаваная ў «Нашай Ніве» ўсяго за дзень да таго, як на саміце ў Брусэлі вырашыўся лёс канстытуцыі эўрапейскай. Фактычна, замест яе будзе дзейнічаць Хартыя (базавае пагадненьне). У яе тэксьце ня згадваюцца сьцяг і гімн Эўрасаюзу, але ўводзіцца пасада прэзыдэнта, які будзе абірацца Радай міністраў на два з паловай гады, а таксама Вярхоўнага прадстаўніка ЭС у справах зьнешняй палітыкі. Пагадненьне пачне працаваць напоўніцу празь дзесяць гадоў, але ўжо ў 2014 г. будзе абраны першы прэзыдэнт.

Зразумела, параўноўваць тэксты Малой Канстытуцыі і эўразьвязаўскага дакумэнту не выпадае. Надта ў розных гістарычных вымярэньнях і рэаліях жывуць сёньня РБ і ЭС. Самі распрацоўшчыкі беларускага дакумэнту падкрэсьлівалі, што ён ствараўся, так бы мовіць, навырост. Так што ацаніць яго значэньне змогуць, хутчэй за ўсё, будучыя гісторыкі.

## «Адзін за ўсіх — і ўсе на аднаго»

Саміт у Брусэлі назвалі адным з самых цяжкіх у гісторыі ЭС. Да апошняга дня невядома было, ці змогуць 27 дзяржаваў супольнасьці дамовіцца пра Канстытуцыю. Польшча і Вялікая Брытанія цьвёрда адстойвалі свае пазыцыі — Польшча выступала супраць прынцыпу «падвойнай большасьці» пры галасаваньні ў Радзе міністраў (рашэньне лічыцца прынятым, калі за яго прагаласавалі ня менш за 55% краінаў-сябраў ЭС і 65% насельніцтва). Вялікая Брытанія выступала супраць спасылкі на Эўрапейскую хартыю правоў чалавека. У выніку брытанцы дамагліся свайго. Акрамя іншага, Англія пакінула за сабой права весьці самастойную міжнародную палітыку і палітыку ў галіне падаткаў.

Польшча пайшла на кампраміс. Пры захаваньні прынцыпу «падвойнай большасьці» краіны, якія апынуцца ў меншасьці, могуць адкласьці выкананьне прынятых рашэньняў.

Трэба адзначыць, што пытаньне Эўрапейскай Канстытуцыі было адным з галоўных прыярытэтаў, абвешчаных канцлерам Ангелай Мэркель падчас старшыняваньня Нямеччыны ў ЭС. Адным з, але не адзіным. Яшчэ больш важным пытаньнем была і застаецца эўрапейская энэргетычная бясьпека. І галоўнай праблемай тут застаюцца рознагалосьсі Нямеччыны з Польшчай наконт будаўніцтва Паўночнага газаправоду, які расейскі «Газпром» разам з кансорцыюмам нямецкіх (і ня толькі) фірмаў зьбіраецца праклясьці на дне Балтыйскага мора. Правы ўрад Польшчы лічыць, што нямецка-расейскае пагадненьне, дасягнутае за яго сьпінай, пагражае энэргабясьпецы Эўропы. Урад Мэркель настойвае: плянаў будаўніцтва, па-першае, ніхто не хаваў, а па-другое, што згаданы газаправод акурат і будзе служыць інтарэсам энэргабясьпекі ня толькі Нямеччыны, але Эўропы ў цэлым.

Тут гаворка не пра дачыненьні Расеі з Эўропай і падступныя пляны «Газпрому». І нават не пра «Гданьскі калідор», які стаў некалі прадвесьнікам Другой Сусьветнай вайны. Ніхто сёньня ня стане абвінавачваць Нямеччыну ў нейкіх агрэсіўных плянах ці ў нацыянальным эгаізьме. Урэшце, сам факт кампрамісу ў пытаньні Канстытуцыі ЭС, які можна лічыць асабістым посьпехам А.Мэркель, гаворыць аб тым, што яна і нямецкі кааліцыйны ўрад выступаюць прыхільнікамі эўрапейскай інтэграцыі.

Польшчы ж дагэтуль, як падаецца, уласьцівы пэўны рамантызм у міжнароднай палітыцы. Можна прыгадаць, як былы кіраўнік правага кабінэту міністраў Казімеж Марцінкевіч, папярэднік цяперашняга прэм'ера Яраслава Качыньскага, выступіў з сэнсацыйнай прапановай — стварыць у Эўропе Пакт энэргетычнай бясьпекі. У прэсе яго назвалі «Пактам мушкецёраў», бо ў аснову энэргетычнай салідарнасьці, так бы мовіць, прапанавалася пакласьці славуты прынцып: «Адзін за ўсіх — і ўсе за аднаго!» Але ж менавіта радзіма аўтара «Трох мушкецёраў» Дзюма — Францыя — першай дыстанцыявалася ад рамантычнай польскай прапановы.

Даволі хутка стала зразумела, што ў пытаньні энэргабясьпекі, асабліва калі вядзецца пра газ і нафту, буйныя эўрапейскія краіны кіруюцца ў першую чаргу прынцыпам «кожны за сябе». ( І дзеля нацыянальных інтарэсаў іх урады гатовыя ісьці на зьдзелку хоць з д'яблам, хоць з «Газпромам».) І толькі потым ужо яны шукаюць кампрамісу зь іншымі краінамі ЭС.

А ў дачыненьні да Польшчы атрымалася зусім ня так, як у Дзюма. Усе накінуліся на аднаго.

## «Сьвет сьветаў»

Знайсьці гэты кампраміс — справа неверагодна цяжкая. Хаця б таму, што Эўрапейскі Зьвяз, у адрозьненьне ад Савецкага Саюзу, ня ёсьць дзяржавай, усе нацыянальныя часткі якой кіруюцца з аднаго цэнтру. Пры ўсёй моцы бюракратычнай машыны, створанай за гады эўраінтэграцыі ў Брусэлі, не тамтэйшыя чыноўнікі вызначаюць палітыку краінаў ЭС, але выбарцы, якія, згодна з нацыянальным заканадаўствам сваіх краінаў, абіраюць нацыянальныя парлямэнты, а таксама фармуюць Эўрапарлямэнт, ад якога залежыць палітыка Зьвязу. Наколькі нацыянальная бюракратыя, якая непазьбежна фармуецца пры любым ладзе, лепшая ці горшая за эўразьвязаўскую — гэта пытаньне з разраду сафістыкі.

Падабенства ЭС з СССР у іншым. СССР называлі «сьветам сьветаў». Зыходзячы з выразнай розьніцы культураў і мэнталітэтаў народаў савецкіх рэспублік, наяўнасьці «нацыянальнай праблемы» (дакладней праблемы самавызначэньня нацыяў), савецкі дысыдэнт Андрэй Амальрык прадказаў яшчэ напачатку 70-х хуткі распад імпэрыі.

Да цяперашняй Эўропы ў яшчэ большай ступені падыходзіць назва «сьвет сьветаў». Калі да Эўразьвязу далучацца Сэрбія, Турэччына, а потым і Украіна, гэтая супольнасьць будзе нагадваць мадэль усяе плянэты з усімі яе канфэсіямі, этнічнымі, расавымі ды іншымі супярэчнасьцямі. Ці азначае

гэта, што ЭС пад ціскам праблемаў абавязкова распадзецца, як СССР?

Думаецца, пакуль існуе Расея ў сваім цяперашнім выглядзе, кіраўніцтва якой апантанае паранаідальнай ідэяй аднавіць моц былога СССР і зноў падмяць пад сябе краіны Балтыі, аднавіць «сфэры ўплыву», такой пагрозы няма. Чым больш Масква будзе нарошчваць энэргетычныя ды іншыя мускулы (паводле выразу амэрыканскага сэнатара Лантаса, «жэрці шпінат», як матрос Папай з мультфільму), тым больш Эўропа будзе імкнуцца да паглыбленьня інтэграцыі ды выпрацоўкі супольнай палітыкі ў галіне энэргетычнай бясьпекі, абароны, міграцыйнага і працоўнага заканадаўства і г.д.

Стварэньне супольнай эўрапейскай Канстытуцыі, як выявілася, тут не галоўнае. Канстытуцыя ўвогуле ня ёсьць галоўным ці нават неабходным элемэнтам заходняй дэмакратыі. У розных краінах гэты дакумэнт, прыняты на розных этапах гісторыі, адыгрываў розную ролю. Польшча, напрыклад, ганарыцца тым, што пры канцы XVIII ст. яна прыняла першую ў Эўропе канстытуцыю. Канстытуцыя ФРН, на падставе якой была прынятая і дзеючая канстытуцыя аб’яднанай Нямеччыны, стваралася ў постакупацыйны пэрыяд, з дапамогай амэрыканскіх юрыстаў. Яна прызнаная экспэртамі адной з найбольш дэмакратычных канстытуцыяў сьвету. Прынамсі, гэты дакумэнт наўрад ці ў чымсьці саступае канстытуцыі Рэспублікі Польшча, у якой у 1992 г. была прынятая Малая Канстытуцыя, а потым яшчэ пяць гадоў дзейнічалі адразу тры (!) Асноўныя законы краіны. У прэамбуле цяперашняй канстытуцыі РП гаворыцца аб хрысьціянскай спадчыне польскае нацыі. Такога ж запісу польскі ўрад дамагаўся і ў прэамбуле эўрапейскае канстытуцыі. Але яна не прынятая. І наўрад ці калі будзе прынятая. Ня будзе й прадмету для далейшых спрэчак. І Турэччына з Альбаніяй гэтым пытаньнем могуць пакуль не турбавацца.

А ёсьць дэмакратычныя краіны, дзе ўвогуле няма пісанай канстытуцыі. Прыклад — Вялікая Брытанія.

Днямі можна было назіраць па тэлевізіі, як Тоні Блэр адзін з апошніх разоў выступаў у якасьці прэм’ера ў брытанскім парлямэнце — як ён адбіваў рэплікі з лаваў апазыцыі, як усьміхаўся дасьціпным жартам апанэнтаў, як рэагавалі ўхвальным грукатам ці незадаволеным мычэньнем дэпутаты.

Парлямэнт, насамрэч, гэта ня толькі гаварыльня, гэта сапраўдная бойка, дзе замест кулакоў трэба ўмець карыстацца словам. Амаль кожны выступ аратара — гэта як выхад на рынг: удар можна атрымаць у любую хвіліну зь нечаканага боку, ды не ад аднаго спаборніка, але ад многіх адразу. Няма й гаворкі пра тое, каб выйсьці на рынг непадрыхтаваным — накдаўн, а мо й накаўт забясьпечаны. Так што мала назваць нейкі сход парлямэнтам і запусьціць туды дэпутатаў. Патрэбныя, прынамсі, некалькі стагодзьдзяў (столькі ж, колькі патрабуецца, каб вырас сапраўдны ангельскі газон) палітычнай барацьбы партыяў, патрэбныя вольная прэса і незалежныя суды, каб парлямэнт зрабіўся парлямэнтам, а ня сходам. І тады канстытуцыя будзе справай другаснай.

## Пачакаем дзьвесьце гадоў

Размова тычыцца палітычнай культуры нацыі, якая непарыўна зьвязаная з культурай нацыянальнай.

За што польская прэса нядаўна спляжыла віцэ-прэм’ера, міністра адукацыі Рамана Гертыха? Гэты інтэлігентнага выгляду палітык, лідэр крайне правай каталіцкай «Лігі польскіх сем’яў» спрабаваў пайсьці шляхам сваіх калегаў у Беларусі — заняўся пераглядам школьных праграмаў літаратуры. У выніку са школьных праграмаў было рэкамэндавана выкінуць Гётэ, Дастаеўскага, Кафку. А выдатны сатырычны твор польскага пісьменьніка Вітальда Гамбровіча «Транс-Атлянтык» (1953 г.), у якім высьмейваюцца стэрэатыпы й штампы польскай народнай культуры, падаўся міністру непатрыятычным. І ён параіў замяніць яго на больш патрыятычныя, хоць і нашмат меней цікавыя зь літаратурнага гледзішча творы Генрыка Сянкевіча. Фактычна ўся творчая польская інтэлігенцыя, незалежна ад палітычных поглядаў, паўстала супраць такога «літаратуразнаўства».

Здавалася б, гэты прыклад ня мае ніякага дачыненьня да тэмы канстытуцыі. Але, па-першае, ён гаворыць аб тым, што самыя лепшыя канстытуцыі ў сьвеце не гарантуюць, што да ўлады ня могуць прыйсьці ўсялякага роду кар’ерысты, прайдзісьветы, рэлігійныя артадоксы і проста дурні. Палітыкаў вылучае маса, і вылучае, як правіла, тых, хто не асабліва на яе тле вытыркаецца. Тым ня менш, у нармальных дзяржавах праходзіць пэўны час, і выбарцы, расчараваныя абранай імі ўладай, выбіраюць сабе новую. А з новай палітыкай прыходзяць і новыя праблемы, новыя выклікі. І так будзе заўсёды. (І вось тут патрэбная канстытуцыя, у якой зафіксаванае права ўсіх грамадзянаў на свабодныя і справядлівыя выбары).

Па-другое, Польшча — толькі адзін, хоць і самы яскравы прыклад таго, як складана праходзіць працэс грамадзкіх пераўтварэньняў у постсавецкіх краінах, а тым больш — іх інтэграцыі ў Эўропу. Эўропу, якая ўся складаецца з унікальных паводле сваёй культуры, гісторыі, мовы, традыцыяў і звычаяў народаў.

Складзецца некалі гэтая мазаіка ў нейкую прыгожую агульную карціну — сказаць цяжка. Гісторыя ня мае мэты. І кожная асобная нацыя зусім не абавязкова марыць пра тое, каб стацца часткай чагосьці нібыта большага за яе. Як ні парадаксальна, гісторыя кожнай нацыі больш каштоўная, чым гісторыя якой заўгодна інстытуцыі — хоць бы такой значнай, як Эўразьвяз. Яны, гэтыя нацыі, фармуюць зьвяз, а ня зьвяз фармуе іх.

Іншая справа, што ёсьць супольныя каштоўнасьці эўрапейскіх народаў, якія нават і ня трэба запісваць у канстытуцыі. Зразумела, можна згадаць падставовыя правы чалавека, можна згадаць таксама права на працу, на адпачынак, на жыльлё, як гэта рабілася ў канстытуцыях савецкіх. Але нават асноўныя правы чалавека застануцца толькі на паперы, пакуль грамадзтва не гатовае прыняць іх як нешта натуральнае і неад’емнае, неабходнае ў рэальным жыцьці.

Што б ні распавядала БТ пра Польшчу ці Нямеччыну, якім бы брудам ні палівала заходнюю дэмакратыю, Эўразьвяз ці ЗША, кожны нармальны чалавек у глыбіні душы ведае — там свабода. Тут яе няма.

А каб стаць свабоднымі, ня трэба чакаць ніякіх канстытуцыяў, ці выбараў, ці лідэраў. Трэба штодзённа ў сваім жыцьці самім падтрымліваць ці тварыць сваю культуру, сваю гісторыю, сваю будучыню. І тады, магчыма, праз дзьвесьце гадоў, у Беларусі вырасьце свой парлямэнтарызм.

# Імклівы рост запазычанасьці

Праблему стабілізацыі фінансавага рынку ўрад вырашыў за кошт рэзкага павелічэньня замежнай пазыкі. Яе памер пакуль некрытычны, аднак эксьпэрты маюць пытаньні да тэрмінаў пагашэньня крыдытаў.

Напружанасьць на фінансавым рынку была зьнятая за кошт павелічэньня замежных пазыкаў. Як варыянт, усур'ёз разглядаліся дэвальвацыя нацыянальнай валюты і продаж дзяржмаёмасьці, паведамляе газэта «Белорусы и рынок».

За 1-ы квартал гэтага году замежны карпаратыўны і дзяржаўны доўг узрос на $1,2 млрд і склаў $8,1 млрд. Да канца году, калі захаваюцца цяперашнія тэмпы прыцягненьня замежных крэдытаў, гэты паказчык можа дасягнуць $11—12 млрд. Варта адзначыць, што за ўвесь 2006 г. памер зьнешняй пазыкі павялічыўся на $1,7 млрд.

Найбольшыя тэмпы росту пазыкаў адзначаюцца ў нябанкаўскай сфэры. Іх доля ў агульнай запазычанасьці складае 63%. Банкаўская запазычанасьць займае другое месца — 22%.

Суадносіны замежнай запазычанасьці і ВУП у мінулым годзе складалі 18,6%, а сёлета могуць скласьці 25%.

На думку эксьпэртаў, крытычны памер зьнешняй запазычанасьці беларускай эканомікай пакуль не дасягнуты. Досьвед усходнеэўрапейскіх краінаў паказвае, што небясьпечнымі для іх ёсьць суадносіны зьнешняй запазычанасьці і ВУП у памеры 80—90%. Цяпер жа ў Чэхіі, Польшчы ды Вугоршчыне гэтыя суадносіны складаюць 40—70%.

Таксама небясьпечнымі лічацца для эканомікі краіны суадносіны запазычанасьці і аб'ёму экспарту ў памеры 130—150%, якія на сёньня ў Беларусі складаюць каля 42%. Гэтыя паказчыкі сьведчаць пра тое, што небясьпечнага па сусьветных стандартах памеру замежная запазычанасьць, пры ўмове захаваньня існуючых тэмпаў яго павелічэньня, вырасьце праз 4—5 год.

Аднак эксьпэртаў непакоіць той факт, што большую частку замежнай запазычанасьці складаюць кароткатэрміновыя крэдыты (доўгатэрміновыя складаюць 31,1%). Гэта азначае, што, акрамя выплаты адсоткаў Беларусі, давядзецца вяртаць каля 70% пазыкі. Для нармальнага функцыянаваньня эканомікі давядзецца праводзіць сталае рэфінансаваньне запазычанасьці — прыцягненьне новых крэдытаў.

Паводле зьвестак газэты «Белорусы и рынок», у бягучым годзе Беларусі з улікам адсоткаў давядзецца выплаціць $7 млрд (для параўнаньня — у 2006 г. — $4 млрд). Гэта стварае для айчыннай эканомікі пэўнае напружаньне. Магчыма, менавіта з гэтым зьвязаная падрыхтоўка да продажу буйных беларускіх прадпрыемстваў.

Выйсьце, на думку эксьпэртаў, у эфэктыўным выкарыстаньні прыцягнутых пазыкаў — не на ажыцьцяўленьне папулісцкіх сацыяльных праграмаў, а на мадэрнізацыю прадпрыемстваў і інфраструктуры.

**Сямён Печанко**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Менскі аўтазавод таксама рыхтуецца да прыватызацыі.**

## Беларусы прадаюць даляры

У першай палове чэрвеня продаж насельніцтвам наяўнай валюты ўпершыню перавысіў куплю. Аб'ём продажаў склаў $210,2 млн, аб'ём куплі — $210 млн.

У траўні сальда куплі-продажу склала мінус $13 млн. фізычныя асобы набылі $448,9 млн і $435,9 млн прадалі.

Перавышэньне прапановы валюты над попытам можна тлумачыць ростам спажываньня, якое тлумачыцца аптымістычнымі настроямі спажыўцоў. Агульныя эканамічныя чаканьні вярнуліся на высокі ўзровень пасьля трывогаў пачатку году, зьвязаных з расейскім энэргетычным шантажом.

Іншыя прычыны, якія могуць патлумачыць унікальную для Беларусі зьяву, — гэта рост выдаткаў на аплату крэдытаў, будаўнічы бум ды большыя, чым у мінулыя гады, выдаткі на летні адпачынак.

**СП**

## У траўні цэны на жытло вырасьлі на 3,4%

Сярэдняя цана прапановы кватэраў на другасным рынку ў Менску вырасла на $62 і дасягнула $1887/м$^2$, паведамляе сайт нерухомасьці Realt.by. Павялічыўся і аб'ём прапановаў — 2647 да 3569 аб'ектаў.

Найбольш у траўні расьлі цэны на трох- і чатырохпакаёўкі — за гэты час яны падаражэлі на 4,6% і 5,6% адпаведна. У той жа час адна- і двухпакаёўкі падаражэлі нязначна — на 0,9% і 2,9% адпаведна. Варта адзначыць, што цэны на кватэры малой плошчы шалелі ўзімку, і цяпер рэзэрв росту проста вычарпаўся.

Па-ранейшаму найдаражэйшыя кватэры ў Цэнтральным ($2131/м$^2$) і Савецкім ($2091/м$^2$) раёнах. Найтаньнейшыя — у Заводзкім раёне: тут кошт 1 м$^2$ каштуе $1735.

У сярэднім цана менскай аднапакаёўкі на сёньня складае $68000 (2011/м$^2$), двухпакаёўкі — $90000 (1899/м$^2$), трохпакаёўкі — $130000 (1905/м$^2$) ды чатырохпакаёўкі — $150000 (1790/м$^2$)

Цэны на новыя кватэры вагаюцца ад 1250 да 2500$ за квадратны мэтар. Сярэдняя цана за мінулы месяц узрасла з 1550 да 1800$/м$^2$.

**СП**

## 21 чэрвеня

### Акадэмія кіраваньня ня йдзе

У судзе Кастрычніцкага раёну адбылася сустрэча бакоў. Яна была кароткай. Судзьдзя **Пракаповіч** запытала ў прадстаўніка Акадэміі, ці згодны той пайсьці на міравую зь **Юрасём Алейнікам**, студэнтам 4 курсу, адлічаным за пропускі. Атрымаўшы адмоўны адказ, судзьдзя прызначыла дату чарговай сустрэчы.

### Пракуратура папярэдзіла

Раніцай супрацоўнікі міліцыі і людзі ў цывільным затрымалі каля дамоў і даставілі ў Менскую гарадзкую пракуратуру трох моладзевых актывістаў **Яўгена Іванюка, Настасьсю Шамарэй** і **Надзею Манцэвіч**. Усім затрыманым вынесьлі папярэджаньні, якія падпісаў намесьнік пракурора Менску старшы саветнік юстыцыі **А.Стук**. У папярэджаньнях вядзецца пра тое, што, «паводле інфармацыі пракуратуры Менскай вобласьці, маладзёны маюць намер арганізаваць і прыняць удзел у дзейнасьці незарэгістраванай арганізацыі «Задзіночаньне беларускіх студэнтаў», у дачыненьні да якой маецца рашэньне Вярхоўнага суду РБ аб ліквідацыі аб'яднаньня, якое ўжо набыло моц».

### Абаронцы Магілёва

У Магілёве захоўваецца напружаная сытуацыя з прычыны будаўніцтва праваслаўнага храму на тэрыторыі Замчышча. 21 чэрвеня прадстаўнікі прыходу затрымалі і адвялі ў пастарунак сябра аб'яднаньня «Гісторыка» **Віталя Ругайна**, калі той спрабаваў сфатаграфаваць катлаван на Замкавай гары. З пастарунку яго адпусьцілі, не знайшоўшы ніякіх парушэньняў. На незаконныя дзеяньні актывістаў прыходу В. Ругайн падрыхтаваў скаргу ў міліцыю.

Днём раней будаўнікі з камянямі ў руках сустрэлі іншага моладзевага актывіста, які фатаграфаваў яміну.

## 22 чэрвеня

### Міхалевіча таксама папярэдзілі

Намесьнік старшыні Партыі БНФ **Алесь Міхалевіч** атрымаў папярэджаньне, падпісанае намесьнікам пракурора Менску **А.Стукам**. Яго таксама перасьцераглі ад удзелу ў незарэгістраванай арганізацыі «Задзіночаньне беларускіх студэнтаў» ды пастрашылі артыкулам 193–1 КК РБ.

### Гайдукевіч назваў палітвязьняў крымінальнікамі

«У Беларусі няма палітвязьняў, і мы на гэтым настойваем»,— заявіў у Рыме спэцыяльны прадстаўнік міністра замежных справаў Беларусі **Сяргей Гайдукевіч**. У часе сустрэчы з італьянскім дэпутатам і дакладчыкам Парлямэнцкай асамблеі Рады Эўропы па Беларусі Андрэа Рыгоні, лідэр Лібэральна-дэмакратычнай партыі падкрэсьліў, што вязьні, пра якіх пішуць на Захадзе, зьяўляюцца звычайнымі крымінальнікамі.

## 25 чэрвеня

### Ю.Алейніка пазбаўляюць адваката

Падчас паседжаньня па справе **Ю.Алейніка** судзьдзя **Пракаповіч** выдаліла з памяшканьня грамадзкага абаронцу **Алега Гулака** на той падставе, што той нібыта ня мае паўнамоцтваў прадстаўляць інтарэсы студэнта ў судзе. Судовае паседжаньне адбудзецца 4 ліпеня ў судзе Кастрычніцкага раёну (вул. Сямашкі, 33) у 14.00, каб. 2106.

## 26 чэрвеня

### Артуру Фінькевічу пагражае турма

Адміністрацыя Магілёўскай спэцкамэндатуры цягам 10 сутак мусіць вызначыць дысцыплінарнае пакараньне для **Артура Фінькевіча**. Палітвязьня могуць пакараць да трох гадоў пазбаўленьня волі. Супрацоўнікі камэндатуры палічылі парушэньнем рэжыму тое, што пасьля адбою хлопец зайшоў у суседні пакой па валідол.

### Суды адмовілі сьвятарам

Судзьдзя Цэнтральнага раёну **Тацяна Паўлючук** адмовіла у задавальненьні пазову пратэстанцкага пастара **Яраслава Лукасіка**, дэпартаванага зь Беларусі. Я.Лукасік прасіў прызнаць незаконным рашэньне старшыні Цэнтральнага РУУС сталіцы, згодна зь якім ён быў аштрафаваны за несанкцыянаванае набажэнства і дэпартаваны.

Судзьдзя Менскага гарадзкога суду **Аляксей Рыбакоў** адмовіў пастару пратэстанцкай царквы «Ян Прадвесьнік» **Антонію Бокуну** ў скарзе на рашэньне суду Цэнтральнага раёну ад 4 чэрвеня. Тады за несанкцыянаванае богаслужэньне судзьдзя Т.Паўлючук асудзіла сьвятара на 3 сутак арышту.

### Узяліся за барысаўскіх

У Барысаве выклікаюць на допыты апазыцыйных актывістаў, паплечнікаў лідэра барысаўскай суполкі Партыі БНФ **Сяргея Салаша**. Пазовы ў пракуратуру атрымалі **Зьміцер Бабіцкі**, **Сяргей Сацук**, **Зьміцер Мацельскі**, **Алег Мацкевіч**. Справу будзе весьці сьледчая **І.Пашкевіч**. У пракуратуру Барысава наведаўся лідэр руху «За свабоду!» **Аляксандар Мілінкевіч**, які меў сустрэчу з пракурорам гораду і раёну **Ўладзімерам Шпакоўскім**. Пракурор заявіў, што ня ведае пра допыты, бо знаходзіўся ў адпачынку. Шпакоўскі паведаміў, што Салаша могуць зьвінаваціць у абразе мясцовага начальства ў СМІ.

**СП**

# Нам дапамагаюць захаваць памяць

Беларускія грамадзкія дзеячы доўга настойвалі: чалавечая памяць кароткая, патрэбная экспазыцыя, прысьвечаная катастрофе на ЧАЭС, нельга дапусьціць, каб пра трагедыю забылі. Здавалася, заклікаў ніхто ў Беларусі ня чуў. Але пачулі за яе межамі — і зьявілася выстава «Згубленая зямля», частка праекту CORE «Практычная радыелягічная культура, перадача памяці паміж пакаленьнямі і народамі», што фінансуецца Эўрапейскай Супольнасьцю пры дапамозе праграмы TACIS.

## Згубленая зямля

Катычаў, Піркі, Асіньнік, Рабінаўка, Савічы, Усьцімле, Ходарава — ад гэтых і іншых беларускіх вёсак засталіся толькі назвы на мапе з кароткай пазначкай *неж.* — нежылая… Выстава «Згубленая зямля», прысьвечаная жыхарам вёсак, якія апынуліся ў зоне адсяленьня, па некалькі месяцаў экспануецца ў розных гарадах краіны. Чаргаваньне каляровых і чорна-белых фатаздымкаў — сувязь мінулага і цяперашняга, паўпразрыстыя палотны з адбіткамі газэтных артыкулаў 1986-га і сямейных фатаздымкаў, усяго больш за 250 экспанатаў… Ніводзін экспанат не падпісаны — для радыяцыі ня мае значэньня, якая гэта вёска. Для яе ўсе роўныя.

Захаваць памяць пра чарнобыльскую катастрофу, не дапусьціць яе забыцьця і перадаць яе гісторыю будучым пакаленьням — асноўная мэта экспазыцыі. «Згубленая зямля» — праект Эўракамісіі, якому няма аналягаў у сьвеце, бо не было ў гісторыі чалавецтва такой страшнай тэхнагеннай катастрофы.

Актыўны ўдзел у падрыхтоўцы выставы прынялі самі жыхары чатырох пацярпелых раёнаў — удзельнікаў міжнароднай праграмы CORE (Брагінскага, Чачэрскага, Слаўгарадзкага і Столінскага), эўрапейскія партнэры — француская асацыяцыя «Спадчына бязь межаў», мясцовыя чыноўнікі.

## Раскажы мне, што нясеш

Працяг міжнароднага праекту «Практычная радыелягічная культура, перадача памяці паміж пакаленьнямі і народамі» CORE — кампанэнт «Раскажы мне, воблака…». Школьнікі Беларусі на працягу году знаёміліся з гісторыяй і наступствамі катастрофы на ЧАЭС, вывучалі асновы бясьпечнага пражываньня на пацярпелых тэрыторыях — і пісалі казкі, ілюструючы іх пры падтрымцы беларускіх мастакоў, пісьменьнікаў і рэжысэраў. Галоўным героем апавяданьня стала радыеактыўнае воблака, што вырвалася са злавеснага чацьвертага рэактару Чарнобыльскай АЭС у красавіку 1986 году. Аблокі, як і неба, ня ведаюць межаў, яны, нібы прывідныя сылюэты, лунаюць над зямлёй, нараджаюць ва ўяўленьні дзіцяці дзівосныя вобразы, якія пасьля знаходзяць сваё адлюстраваньне ў казачных гісторыях. Даючы волю фантазіі, дзеці праілюстравалі іх сваімі малюнкамі, а пасьля, стаўшы кінаакторамі, прынялі ўдзел у здымках 10-хвіліннага кароткамэтражнага фільму.

І ў чэрвені ў Брагіне прайшоў фэстываль-прэзэнтацыя, які сабраў больш за 300 удзельнікаў і гасьцей зь Беларусі, Украіны, Францыі і Расеі.

Цяпер чакаецца выпуск ілюстраванага зборніка, у які ўвойдуць каля 60 казак, а таксама дыск зь відэаверсіяй публікацыі на расейскай, францускай і ангельскай мовах. Найлепшыя фільмы-казкі прымуць удзел у заключнай цырымоніі ўзнагароджваньня, якая адбудзецца ў Парыжы ў кастрычніку 2007 году.

**Тэматычны праект Эўразьвязу CORE «Практычная радыелягічная культура, перадача памяці паміж пакаленьнямі і народамі» аб'ядноўвае некалькі буйных кампанэнтаў. Праект накіраваны на распаўсюджваньне ведаў па радыеэкалёгіі, ён спрыяе захаваньню памяці пра чарнобыльскую катастрофу і ўмацаваньню салідарнасьці жыхароў Беларусі і міжнароднай грамадзкасьці з пацярпелым насельніцтвам. На рэалізацыю праекту Праграмай TACIS заяўлена звыш 325 тыс. эўра.**

Дадзеная публікацыя падрыхтаваная пры спрыяньні Эўразьвязу і не абавязкова адлюстроўвае афіцыйны пункт гледжаньня ЭЗ.
Па дадатковую інфармацыю зьвяртайцеся на сайт www.delblr.ec.europa.eu

# Цуд, зафіксаваны кінакамэрамі

З 20 да 24 чэрвеня на Глыбоччыне праходзіў III Міжнародны каталіцкі фэстываль хрысьціянскіх фільмаў і тэлепраграм «Magnificat-2007».

Да традыцыйных месцаў паказу (Глыбокае, Мосар) дадалася вёска Івесь, дзе знаходзіцца адзін зь беларускіх «цэнтраў Эўропы». У Івесі адбылася й закладка алеі фэстывалю: пасадзілі чатырнаццаць дрэваў, па колькасьці краінаў-удзельніц фэсту.

Было паказана 43 стужкі. Гран-пры атрымала італьянская карціна «Ў Сыракузах, дзе Марыя плакала». Гэта дакумэнтальнае сьведчаньне цуду, зафіксаванага кінакамэрамі.

Беларуская перадача «Лёс чалавека. Айцец Казімер Жыліс» стала наймацнейшай сярод тэлепраграмаў. Калі сам ксёндз Казімер, які мужна адстойваў веру за савецкім часам, прыехаў на фэст, яму наладзілі авацыю.

Герой дэбютнае стужкі Андрэа Куцілы «Паэма веры» — інак Мікалай (Алег Бембель).

Была і незвычайная прэм’ера. Стужку «Чары прыроды. У лесе» зьняў ксёндз Казімер Сьвёнтак — калі яшчэ быў простым пробашчам пінскага касьцёлу.



**Фэстываль адкрывае апостальскі нунцый Марцін Відавіч.**

Усе замежныя стужкі, акрамя расейскіх, ішлі па-беларуску. Фільмы фэстывалю будуць выстаўленыя ў інтэрнэце на сайце signis.by.

**Андрэй Расінскі**

## СЬЦІСЛА

### Чаго дабіліся?

Купальскі канцэрт у Гомелі быў забаронены, але ўсё ж адбыўся. Гарадзкія ўлады спрабавалі сарваць імпрэзу, адмовіўшы арганізатарам у замоўленай залі. Канцэрт перанесьлі на офіс Грамадзянскай партыі. Перад гледачамі выступілі Зьміцер Бартосік і Зьміцер Вінаградаў, Андрусь Мельнікаў і Вальжына Цярэшчанка, а таксама Яўген Валошын.

### Фрашкі Квяткоўскага

20 чэрвеня ў кавярні «Стары Менск» адбылася прэзэнтацыя кнігі Севярына Квяткоўскага «Фрашкі да пляшкі». Квяткоўскі пачынаў



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

творчы шлях у «НН» у сярэдзіне 90-х, а цяпер працуе на радыё «Свабода». Яго кніга — зборнік анэкдотаў з жыцьця вядомых у краіне музыкаў, палітыкаў, літаратараў і журналістаў. А таксама паспалітых людзей: таксістаў, пастухоў, памежнікаў, прадаўцоў, міліцыянтаў.

### У Менску граў «Тінь сонця»

25 чэрвеня ўкраінскі гурт «Тінь сонця» выступіў на 1-м міжнародным купальскім фэсьце «Купальскае кола». Лідэр гурту Сяргей Васілюк прызнаўся ў любові да беларускай музыкі: «Мне імпануе ліцьвінская ідэя. Беларуская стыхія ніколі не была мне чужой, бо мая бабуля паходзіць з поўначы Чарнігаўскай вобласьці. І беларуская мова для мяне як родная».






### Групавы партрэт з Бабай Броняй

20 чэрвеня ў музэі Максіма Багдановіча прайшла літаратурная акцыя «Групавы партрэт з Караткевічам». Быў прэзэнтаваны зборнік пераможцаў конкурсу маладых літаратараў імя Караткевіча «Групавы партрэт з Бабай Броняй». Конкурс ладзіў ПЭН-Цэнтар, зборнік уклалі Андрэй Хадановіч і Ганна Кісьліцына.

**Арыман; Ніўскі; За-сь**

## Найлепшыя знаўцы мовы — у Чэрвені, Крупках і Негарэлым

На выходных сталі вядомыя вынікі цэнтралізаванага тэставаньня па беларускай мове. Прыемнай нечаканасьцю сталі тры 100-бальныя вынікі. Атрымалі іх выхаванцы Чэрвеньскай гімназіі № 1, Крупскага ліцэю і сярэдняй школы пасёлку Негарэлае. Летась найлепшым быў вынік у 98 тэставых балаў, які набралі толькі два чалавекі.

## Макс Мірны на Купальлі ў Лёндане

Сьвяткаваньне Купальля ў асяродку Марыян Гаўз зьбірае ўсіх беларусаў Лёндану. Сёлета на сьвяце былі тры дыпляматы беларускага пасольства на чале з консулам і тры журналісты БТ. Прыехаў і Максім Мірны. Ён прыбыў у Вялікабрытанію для ўдзелу ва Ўімблдонскім турніры. Цікава, што два з трох дыпляматаў былі ў вышываных кашулях.

## Маленькага Арцёмку ратавалі ўсёй грамадой

Паўтарагадоваму Арцёмку Небакаткіну ў Маскве зрабілі складаную аперацыю па перасадцы печані. Неабходныя 3 млн расейскіх рублёў (каля 250 млн нашых) зьбіралі для шматдзетнай сям'і Небакаткіных ня толькі на Віцебшчыне, але па ўсёй краіне. Дапамагалі як прыватныя асобы, так прадпрыемствы і ўстановы.

Банкаўская раздрукоўка тых, хто пералічыў сродкі, аказалася некалькі мэтраў у даўжыню. Сама спадарыня Ала ахвяравала для перасадкі сыну сваю печань.

## Выхаванцы Міpановіча згуляюць з чэмпіёнамі

22 чэрвеня ў Осла (Нарвэгія) было лёсаваньне фінальнай стадыі чэмпіянату Эўропы па гандболе. Ён пройдзе ў студзені 2008 г. у гэтай краіне. Зборная Беларусі (трэнэр — Спартак Міpановіч) трапіла ў групу «С». Разам з намі будуць гуляць зборная Нямеччыны (чэмпіён сьвету—2007), а таксама Гішпаніі і Вугоршчыны.

Нагадаем: беларусы ўпершыню за 14 гадоў трапілі на кантынэнтальнае першынство.

## Пунтуса дастала

Галоўны трэнэр футбольнай зборнай краіны Юры Пунтус папрасіўся ў адстаўку. Сярод прэтэндэнтаў на яго месца — Анатоль Байдачны і Міхаіл Вергіенка, а таксама «коўч» моладзевай зборнай Юры Курненін.

## У Чалябінску загінуў беларускі хакеіст

У Чалябінску (Расея) загінуў хакеіст зборнай Беларусі і менскага «Юнацтва» Аляксей Савін. Хлопца, які катаўся на ровары, зьбіў аўтамабіль. Аляксей Савін нарадзіўся ў 1986 г. у Чалябінску. Ён выступаў за «Гомель», за менскія «Юніёр» і «Юнацтва». У складзе апошняй стаў двухразовым чэмпіёнам краіны (2005, 2006).

## Удава Мілошавіча — каралева кантрабандыстаў

Пракуратура Сэрбіі абвясьціла ў міжнародны вышук удаву Мілошавіча, Міру Маркавіч, якая падазраецца ў арганізацыі сеткі па кантрабандзе цыгарэтаў. Пракуратура мае намер абвесьціць у вышук і яе сына — 32-гадовага Марка Мілошавіча. Паводле некаторых дадзеных, яны могуць хавацца ў Расеі. З-за боязі арышту яны нават не прыехалі на пахаваньне Слабадана Мілошавіча ў сакавіку 2006 г.

**Паводле радыё «Свабода», nieszczarda.livejournal.com; Ягор Шумскі; ЗП; Прессбол; агенцыя AFP; БЕЛТА; «Звязда»; Радыё Рацыя**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**У ноч з 23 на 24 чэрвеня беларусы сьвяткавалі Купальле. Так гэта выглядала ў Ракаве. Падрабязьней — на старонцы 16.**

# Купальле ў Ракаве

Фотарэпартаж Юліі Дарашкевіч і Андрэя Лянкевіча.









# Дзякуй

**Уладзімеру Д.**, **Фёдару Г.** з Мазыра.

**Натальлі Т.** з Салігорску.

**Андрэю А.** зь Менскага раёну.

**Лекадзіі Н.** з Валожынскага раёну.

**Аляксандру М.** з Астравецкага раёну.

**Сяргею С.**, **А.А.**, **Валеру П.** з Баранавіч.

**Уладзімеру А.** з Вушацкага раёну.

**Мікалаю С.**, **Зьмітру В.** зь Мядзельскага раёну.

**Ю.Б.**, **Уладзіславу І.**, **Яну Дз.** зь Віцебску/

**Людміле Р.** з Капыльскага раёну.

**У.Б.** з Ваўкавыскага раёну.

**Васілю Б.** са Шчучынскага раёну.

**Зоі Ж.** з Горадні.

**Анатолю М.** зь Ліды.

**Міхаілу А.** зь Нясьвіскага раёну.

**А.А.** з Магілёва.

**Анатолю М.** з Наваполацку.

**Гражыне К.** з Гарадзенскага раёну.

**Уладзімеру К.** з Жыткавіцкага раёну.

**Віталю Ц.** са Жлобіна.

**А.П.**, **Г.Л.**, **Пятру М.** з Маладэчна.

**А.З.**, **Сяргею К.**, **Віктару А.**, **Н.К.**, **У.С.**, **Валеру Р.** з Гомелю.

**Іне П.** са Шклоўскага раёну.

**Паўлу Л.** з Глыбоцкага раёну.

**Сяргею Л.**, **Тамары Ф.**, **Міхаілу Ш.**, **Ігару Б.**, **Васілю Г.**, **Віктару Б.**, **Уладзімеру В.**, **Лідзіі С.**, **Зоі Л.**, **Валянціне Я.**, **Феадосіі Я.**, **Надзеі М.**, **Антаніне П.**, **М.Т.**, **Уладзімеру Л.**, **Яўгену Б.** зь Берасьця.

**Аляксандру Ш.** з Жодзіна.

**С.Ш.**, **Марыі Б.**, **Р.М.**, **Аляксею Ж.**, **Лідзіі І.**, **Анатолю К.**, **Вользе Б.**, **Натальлі Р.**, **Сяргею М.**, **Вользе Ж.**, **Э.Б.**, **Генадзю Б.**, **Марыі В.**, **Але Р.**, **І.П.**, **Іне З.**, **Валерыі Ч.**, **Сяргею У.**, **Тамары К.**, **Лілії Ж.**, **Зьмітру П.**, **Уладзімеру М.**, **Георгію П.**, **Багуславу У.**, **Зэеву Бэн-Ар'е**, **Зьмітру М.**, **Зьмітру Л.**, **Валянціну М.**, **Лявону Г.**, **В.З.**, **Уладзімеру Г.**, **Сяргею П.**, **Алегу Т.**, **Міхаілу Т.** зь Менску.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

**дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.**

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@tut.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначайце адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

Па пытаньнях атрыманьня газэты пытайцеся Рамана.

## Мода і стыль

**«Няма нічога хлусьлівей за моду і праўдзівей за стыль», — гэта старая як пажэжынскі цардуб прыказка.** Паглядзім вачыма моды і стылю ў палітычную сфэру.

Мода на каляровыя рэвалюцыі заахвоціла дэмсілы выбраць свой колер. Анатоль Лябедзька выказаўся пра «джынс». Ці ня модай на гэтую тканіну ён аргумэнтаваў свой выбар? А потым спыніліся на цёмна-сінім — колеры ўпэўненасьці. У далейшых падзеях гэтыя два колеры адыгрывалі аднолькавую ролю (пасьля выбараў «джынс» меў перавагу, але канчатковa страціў аўтарытэт пасьля, на мой погляд, бессэнсоўнай акцыі «Вялікі джынсавы фэст»).

Мода на «джынс» і сіні колер прайшла. Дык што: будзем прыдумляць новае? Падчас выбараў усе імкнуліся начапіць на заплечнікі сінія і джынсавыя стужачкі, але ніхто не выракаўся «Пагоні» і бел-чырвона-белага сьцягу. Ці састарэлі за 12 гадоў пасьля рэфэрэндуму герб «Пагоня» і бел-чырвона-белы сьцяг? Не. Дык навошта прыдумляць колер, калі мы яго маем з самага нараджэньня Беларусі?

Бел-чырвона-белыя фарбы апынуліся на значках «За Свабоду!». Так! Гэтыя значкі сталі папулярнымі сярод моладзі, і ў першы час іх нават стала бракаваць. Мы зь сябрамі дарылі іх хлопцам і дзяўчатам толькі пасьля правільнага адказу на пытаньне: «Што азначае гэты значак?» і тлумачэньня, навошта іх насіць. Але ішоў час, значкаў станавілася ўсё болей. Раздаваліся яны кожнаму жадаючаму ды па некалькі штук. А зараз увогуле зьявіліся нават на чорным фоне, ці белая птушка «свабода» на чорна-чырвоным фоне. Сымбалічна? Мне сумна, што пад уплывам моды мы сталі меней задумвацца над сэнсам.

І што мы бачым праз год пасьля выбараў? Ці паболела значкаў на вуліцах вашага гораду? Цяпер кожны юнак, які лічыць модным насіць такі значак, не спрабуючы задумацца над сэнсам яго, не шкадуючы здыме яго пасьля першай жа заўвагі выкладчыка.

Цяпер зьвернем увагу на «імгненныя натоўпы».

Калі палітычныя флэш-мобы пачалі пашырацца, многія з надзеяй глядзелі на новую форму барацьбы. Цяпер у Менску спэцслужбы не даюць сабрацца, а ў Берасьці дастаткова было аштрафаваць пяць чалавек, каб актыўнасьць у гэтым кірунку згасла.

Хочацца верыць, што флэш-мобы ня зьнікнуць, а стануць ня толькі формаю пратэсту, але і стылем барацьбы.

Пытаньні ўзьнікаюць і ў іншых акцыях, такіх як «Дзень Еднасьці» (чаго чакалі арганізатары ад спалучэньня чырвона-зялёнага і бел-чырвона-белага?), «Чарнобыльскі Шлях», падчас якога сама трагедыя і яе наступствы сыходзяць на другі плян, даючы месца выказацца лідэрам па ўсіх набалелых пытаньнях. А ўзгадайце нерашучасьць сталай апазыцыі падчас «Плошчы». Мне сумна, бо, здаецца, гэта — стыль барацьбы. І я наўмысна ня буду падводзіць вынікаў. Проста яшчэ раз паўтару: «У імкненьні рабіць штосьці мы часта не задумваемся аб будучых выніках!» Праходзіць час, і мода старэе.

**Юрка Бакур, Дзівін—Берасьце—Горадня**

## Чытач «НН» адстаяў права на льготы

**11 траўня ў «НН» (№17) быў надрукаваны адказ на ліст чытача пад назовам «У прафсаюз — толькі зь пісьмовай згоды працаўніка».** Наш чытач паведамляў, што на ягоным прадпрыемстве адбываўся добраахвотна-прымусовы запіс у афіцыйны прафсаюз. Нязгодным пагражалі, што пасьля 1 траўня пазбавяць ільготаў і надбавак. «НН» зьмясьціла камэнтар першага намесьніка міністра працы і сацыяльнай абароны А.Коласа, які датычыўся акурат правоў працаўнікоў, якія не зьяўляюцца сябрамі афіцыйнага прафсаюзу.

Цяпер Рэдакцыя атрымала ліст з падзякамі чытача. У лісьце паведамляецца, што ён і яго калега дамагліся свайго — ад 1 траўня на іх распаўсюджваюцца ўмовы калектыўнай дамовы, і яны маюць права на ўсе льготы і надбаўкі бяз «членства» ў афіцыйным прафсаюзе.

**СП**

## Супраць прэзыдэнта? Вылазь з маршруткі!

**Адна жанчына пабачыла ў менскай маршрутцы партрэт прэзыдэнта.** Запытала ў кіроўцы: «Што тут у вас за ікона вісіць?» Кіроўца пакрыўджана адказаў, што гэта не ікона, а партрэт Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі, прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь. Жанчына запытала ізноў: «А навошта тут гэты партрэт?» Замест адказу кіроўца спыніўся на бліжэйшым прыпынку і загадаў пасажырцы выбірацца: «Вылазь! Я ворагаў народу вазіць не зьбіраюся!» Ледзь не пабіліся.

**Пасажыр той маршруткі**

## Маладэчна па-наску прывітала гасьцей

**Падчас Нацыянальнага фэстывалю беларускай песьні і паэзіі**, які традыцыйна ладзіцца ў Маладэчне, актывісты дэмакратычнага руху на ўезьдзе ў горад, на дрэвах уздоўж аўтамабільнага мосту, вывесілі бел-чырвона-белыя сьцягі. Гэтае месца адно з самых прыгожых пры пад'езьдзе да Маладэчна: старыя дрэвы ўтвараюць алею, якая разрываецца мостам панад чыгункай. Нацыянальныя сьцягі ўтварылі нібыта арку.

Акцыяй яны хацелі выказаць паважныя адносіны многіх жыхароў гораду да нацыянальных сымбаляў і прывітаць гасьцей фэстывалю, які сёлета прысьвечаны 125-годзьдзю Янкі Купалы і Якуба Коласа.

**Юрась Бусел, Маладэчна**

## Пількаўшчына ў заняпадзе

**У Таварыстве Беларускай Культуры ў Літве стала традыцыяй ладзіць падарожжы.** Яшчэ ў сакавіку быў прапанаваны маршрут па Мядзельшчыне: Вільня—Камарова—Канстанцінава—Нарач—Мядзель—Пількаўшчына—Вільня.

Сонечнай раніцай на трох машынах выехалі зь Вільні, праехалі мяжу. У Канстанцінаве ў нас была заплянаваная сустрэча з краязнаўцам Янкам Драўніцкім. Разам наведалі касьцёл Маці Божай Нястомнай Дапамогі ў Шэметаве, помнік клясыцызму, пабудаваны ў форме крыжа, асабліва ўразілі вітражы выключнай мастацкай вартасьці.

У Камарове, у якой захаваліся забудовы к.XIX—п.XX ст. Я.Драўніцкі паказаў пантэон на мясцовых могілках, расказаў гісторыі, зьвязаныя з родам Хамінскіх.

На другі дзень мы наведалі Нарач (да 1964 г. Кабыльнікі), дзе нарадзіўся прафэсар Чэслаў Кудаба, ён адраджаў беларускае жыцьцё ў Вільні ў канцы 80-х, як памяць пра сябе пакінуў кнігу «Па Віліі».

У Мядзелі было наведваньне выставы мастака Алеся Цыркунова ў краязнаўчым музэі. Партрэты Ф.Скарыны, Янкі Быліны, Максіма Танка. Засталіся мы вельмі задаволенымі выставай і тым, што музей быў у нядзелю адчынены.

Пількаўшчына — апошняя кропка падарожжа. Доўга шукалі дарогу, ніякіх указальнікаў няма. Дом, дзе нарадзіўся Максім Танк, Народны Паэт Беларусі, у заняпадзе, страха з адарваным шыфэрам хутка пацячэ, ніякай шыльды, якая б сьведчыла аб паэце, а ў дом нас нават не пусьцілі, групу зь пятнаццаці чалавек. І не віна ў гэтым хворага, пажылога брата Максіма Танка. На магіле таксама даўно ніхто ня быў, ляжалі выцьвілыя штучныя кветкі, дротам прывязаны крыжык на магіле дзеда паэта.

Дзе ж вы, патрыёты? Можа ў мясцовай школе не вывучаюць беларускую мову, ня ведаюць, хто тут нарадзіўся і знайшоў вечны спачын, праславіў на ўвесь сьвет гэты куточак Мядзельшчыны? Вярталіся сумныя, слоў для камэнтараў не было.

**Леакадзія Мілаш, Вільня**

## Будуюць жыцьцё дзецям, ламаючы сваё

**Кожны жыхар Беларусі быццам жыве ў дзьвюх краінах.**

Краіна, дзе ўсё працавітае, дзе няма заганаў і супярэчнасьцяў… Гэта тая краіна, якую нам малююць газэты і тэлебачаньне.

І краіна, дзе памірае мова, культура, дзе парушаюцца правы і законы…

Кожны мае права выбраць. Можна наступіць на асабістую годнасьць, скарыцца і жыць у краіне прыдуманага шчасьця, робячы кар'еру і прагнучы грошай. Але тады перастаеш быць чалавекам і ператвараешся ў пешку ў чужой гульні.

Але шмат хто верыць у нашу свабодную, незалежную Радзіму, у сьветлую будучыню, у свае сілы. Яны будуюць жыцьцё ня толькі сваім дзецям, пры гэтым ламаючы свае жыцьці, а ўсяму сьвету.

Ня трэба жыць з думкай, што ад цябе нічога не залежыць. Наадварот! Устань з канапы, выкажы сваю думку, пастой за яе, і толькі тады ты зможаш адчуць сябе гаспадаром свайго жыцьця.

**Ганна, Менск**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас:**
**а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# Археоляг адкапаў Полацак князя Рагвалода

Полацак, спалены князем Уладзімерам, і найстарэйшая выява Сафіі — сэнсацыі селетняга археалягічнага сэзону.

Раскопкі на старажытным полацкім гарадзішчы ідуць усяго тры тыдні. Але ўжо далі некалькі сэнсацыяў. Адна зь іх — медны крыж з выявай князя, што трымае на далоні макет храму. «На малюнку выразна прасочваюцца тры апсыды, а менавіта наша Сафія мела іх у такой колькасьці», — кажа кіраўнік экспэдыцыі, кандыдат гістарычных навук Дзяніс Дук **(на здымку)**. А хто ж князь, які трымае на далоні Сафію? Найхутчэй, сьвяты

Зараз археолягі знаходзяцца над тэрыторыяй папялішча, датаванага X ст. «Мы маем шэраг знаходак, што сьведчаць пра прыналежнасьць гэтага слою да часоў захопу Полацку наўгародзкім князем Уладзімерам», — распавядае полацкі археоляг. Большасьць адшуканых тут рэчаў — знаходкі мілітарнага характару: рэшткі зброі, наканечнікі стрэлаў, таксама ёсьць побытавыя рэчы і цацкі. Але галоўная мэта сёлетніх раскопак, пер-



XIMIK.INFO

Барыс, стрыечны дзед Усяслава Чарадзея, мяркуе вучоны. Гэтая выява Сафіі — найстарэйшая са знодзеных.

Яшчэ адна знаходка — барэльеф з выявай Божай Маці, што аплаквае Хрыста. «Барэльеф датаваны канцом XI — пачаткам XII ст., і гэта ня менш каштоўная знаходка, чымся крыж», — кажа спадар Дзяніс.

шых, дарэчы, пасьля 1962 г., — адшукаць культурны пляст старажытнага Полацку IX ст., а таксама пашырыць тэрыторыю досьледаў.

Раскопкі працягнуцца да канца ліпеня. Пакуль яны прыпыненыя. Перапынак вымушаны — не хапае людзкога рэсурсу. Дагэтуль на старажытным гарадзішчы працавалі пераважна школьнікі зь мясцовых школаў. Археоляг чакае, калі скончыцца сэсія ў студэнтаў. Для працы патрэбна ня болей за 30 чалавек, бо тэрыторыя раскопак невялікая. Даводзіцца шукаць паразуменьня зь мясцовымі жыхарамі: капаюць жа на прыватным падворку. «З гаспадарамі пакуль ня сварымся», — сьмяецца Дзяніс Дук.

**Сямён Печанко**

# Гісторыя ў ЭГУ: Усё, што вы хацелі б ведаць

Праграма «Гісторыя Беларусі і культурная антрапалёгія» Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту ўнікальная. Само па сабе вывучэньне яе ў Вільні спрыяе разуменьню ва ўсясьветных кантэкстах. Дый сабраліся ў ЭГУ вядомыя навукоўцы: Генадзь Сагановіч, Андрэй Кіштымаў, Алесь Смалянчук, Сяргей Харэўскі. Большасьць дысцыплінаў выкладаецца па-беларуску. Падрабязней пра навучаньне ў ЭГУ распавёў прафэсар, дэкан факультэту мастацтваў і гісторыі культуры Аляксандар Каўбаска.

**«Наша Ніва»: Куды пойдзе працаваць выпускнік літоўскага ўнівэрсытэту, скончыўшы курс «Гісторыі Беларусі»?**

**Аляксандар Каўбаска:** Студэнты з такой шырокай адукацыяй — гісторыка-культуралягічнаю — запатрабаваныя і ў якасьці выкладчыкаў, дасьледчыкаў, супрацоўнікаў музэяў. Для людзей, схільных да навуковых дасьледаваньняў, у нас пачала працаваць магістарская праграма «Інтэрпрэтацыя і ахова культурнай спадчыны». Мінулы год паказаў, што яна цікавая для беларускіх выпускнікоў. Да нас прыйшлі людзі з розных сфэр, з турбізнэсу. Мы таксама праводзім нефармальнае навучаньне, прымаючы студэнтаў пятага курсу ВНУ.

**«НН»: Вашая мэтадалёгія альтэрнатыўная мэтадалёгіі беларускіх ВНУ?**

**АК:** Гэта, безумоўна, крок наперад у параўнаньні са старой мэтадалёгіяй. Мы спадзяемся, што нашыя студэнты будуць ня толькі ведаць факты, але і карыстацца сучаснымі мэтадамі ў іх інтэрпрэтацыі. У той жа час нельга выламаць з калена цалкам новую традыцыю.

Дарэчы, у плянах супрацоўнікаў праграмы выданьне спэцыялізаванага штогадовага часопіса, у якім будуць працы нашых выпускнікоў, выкладчыкаў, дасьледчыкаў.

Курсы, заяўленыя ў праграме, шмат у чым аўтарскія, і мы прапануем выкладчыку выбар: карыстацца гатовымі падручнікамі ці зрабіць рыдэры з уласных тэкстаў.

Нефармальны ў нас падыход і да курсавых, дыплёмных працаў, тэмы якіх студэнт выбірае самастойна, у адпаведнасьці са сваімі зацікаўленасьцямі.

**«НН»: Выпускнікі здольныя адаптавацца да беларускага акадэмічнага асяродку?**

**АК:** Баюся, не. Калі асяродак выкідае такіх навукоўцаў, як Сагановіч, Кіштымаў, Тарасаў. Але ўпэўнены: нашы гадаванцы натуральна ўліюцца ў эўрапейскі навуковы кантэкст.

**«НН»: Ці не баіцёся, што многія ўспрымаюць ЭГУ як спосаб уцячы за мяжу?**

**АК:** ЭГУ дае рэальную магчымасьць навучацца далей у Эўропе, і ў такім жаданьні няма нічога кепскага. Іншая справа, што выпускніку прыйдзецца пераадольваць дыскамфорт, сутыкнуўшыся з побытавымі ці адміністрацыйнымі рэальнасьцямі ў школах ці ўстановах Беларусі. Гэта і канфлікт паміж унутранай свабодаю і ідэалягічнымі абмежаваньнямі. Наколькі людзі дадуць рады гэтым праблемам, залежыць ад кожнага зь іх. Мы ўпэўненыя, што навучаем людзей для Беларусі.

**Гутарыла Алена Пліска**

# Адсутнае зьвяно

Між natio lituanica ВКЛ і сучаснай беларускай нацыяй: кнігу **Матыяса Ніндарфа** рэцэнзуе **Алег Дзярновіч**.

Па-за гістарычнымі межамі былой Рэчы Паспалітай ці не найбольшую ўвагу на гісторыю Вялікага Княства Літоўскага зьвяртае нямецкая гістарыяграфія. Адметнасьць яе ў тым, што на базе стараннага вывучэньня польскай, літоўскай ды беларускай літаратуры сучасныя нямецкія гісторыкі пераходзяць да ацэнкі вельмі важных ці комплексных зьяваў, факусуюць увагу на мэтадалягічныя праблемы, падаюць шырокую панараму культурных і сацыяльных працэсаў. Беларускія гісторыкі, у сваёй масе, ухіляюцца ад падобнага, аддаючы перавагу старannай прапрацоўцы асобных сюжэтаў. І маюць тут несумненныя заслугі. Працу ж гісторыка з Кілю Матыяса Ніндарфа пасьпелі высока ацаніць адмыслоўцы, яна ўжо атрымала ўзнагароду польскага «Агляду Ўсходняй Эўропы» за 2006 г. у катэгорыі замежных выданьняў.

У шырэйшым, мэтадалягічным, сэнсе тэма кнігі нямецкага дасьледчыка — гэта праблема «адсутнага зьвяна» («missing link») між сярэднявечнымі этнасамі (nationes) і сучаснымі нацыямі. Канкрэтна гэта абмяркоўваецца на прыкладзе Вялікага Княства Літоўскага ў часы паміж Люблінскай уніяй і




Niendorf, Mathias. *Das Großfürstentum Litauen. Studien zur Nationalbildung in der Frühen Neuzeit (1569—1795).* — Wiesbaden: Harrassowitz Verlag, 2006. — 329 S. (Veröffentlichungen des Nordost-Instituts. Band 3).

Ніндарф, Матыяс. *Вялікае Княства Літоўскае, 1569—1795. Штудыі да ўтварэньня нацыі ў раньнім Новым часе (1569—1795).* — Вісбадэн: Harrassowitz Verlag, 2006. — 329 S. (Публікацыі Паўночна-Ўсходняга Інстытуту. Том 3).



**Сойм Рэчы Паспалітай. З шляхецкай нацыі не нарадзілася палітычная ліцьвінская нацыя.**

Трэцім падзелам Рэчы Паспалітай.

На сыходзе Сярэднявечча канстатавала сябе *natio lituanica*. У яе рамках адрозьненьні ў паходжаньні, этнічнай і канфэсійнай прыналежнасьці шляхты не былі зьнішчаныя, але іх значнасьць была зьніжаная. Апошняя язычніцкая краіна Эўропы разам з тым далучылася да заходняга напрамку разьвіцьця кантынэнту. Пасьля заключэньня рэальнай Уніі з Польшчай у 1569 г. Вялікае Княства Літоўскае зноў ішло сваім уласным шляхам. Кірунак стаў вызначацца ўсё больш цесным злучэньнем з Польшчай, але пры гэтым Вялікае Княства фармальна не згубіла сваю самастойнасьць, аж да гібелі дуалістычнай манархіі. Па сутнасьці, самастойнасьць ВКЛ абапіралася на тры кампанэнты: міт пра паходжаньне ліцьвінскай шляхты ад рымлянаў, традыцыю вобразаў вялікіх уладароў на чале зь вялікім князем Вітаўтам і, нарэшце, на ўласную прававую сыстэму, якая атрымала закончаную кадыфікацыю ў Статуце 1588 г.

Як адваротны выпадак — не адбылося далейшага разьвіцьця літоўскага самаразуменьня. У прыватнасьці, не дайшло да пастуляваньня спэцыфічнай місіі Літвы, таксама не адбылося фармуляваньня па-ліцьвінску акцэнтаванай «канцэпцыі свабоды», аналягічнай уяўленьням у Польшчы ці ў іншых эўрапейскіх краінах. Усё слабей адчувалася тая падтрымка, якую літоўская самасьвядомасьць магла знайсьці ў царкоўнай сфэры. Літва, якая пасьля трыюмфальнага шэсьця Контрарэфармацыі пераважна шанавала вяршэнства Папы, хоць адрозьнівала сябе зьнешне ад Швэцыі, Прусіі, Расеі, Крымскага ханства і Асманскай імпэрыі, але не ад Польшчы. Праўда, у рамках гэтых двухбаковых адносінаў культ Казіміра, абвешчанага ў 1602 г. сьвятым апекуном Вялікага Княства, у пэўнай ступені сыгналізаваў пра прэтэнзіі на раўнапраўе.

Падобным чынам шанаваньне культу Дзевы Марыі таксама зьвязвалася з палітычнымі выказваньнямі, якія ідэнтыфікаваліся з супольнасьцю шляхецкага народе Рэчы Паспалітай, часткова таксама зь літоўскім і адпаведна русінскімі акцэнтамі. Тое, што адрозьнівала гэтыя спробы ад нацыянальнай мабілізацыі ў сучасным сэнсе слова, было зьвязанае са спэцыфікаю тагачаснага грамадзтва: культы Марыі і Казіміра раньняга Новага часу заставаліся неад’емна зьнітаванымі з саслоўным ладам. Галасы, якія ў духу гуманізму


Матыяс Ніндарф.

больш ці менш упэўнена зьвязвалі ўяўленьні пра ідэнтычнасьць з адстойваньнем няпольскай народнай мовы, заціхалі непачутымі. Пасьля інтэграцыі ліцьвінскай шляхты ў адзіны зьвяз з Польшчай, не пазьней чым зь сярэдзіны XVII ст., бракавала аратараў, якія б маглі агучваць ды ажыцьцяўляць праграмныя ўяўленьні пра Вялікае Княства.

Спачатку традыцыйнае паняцьце шляхецкай нацыі не падаецца прынцыпова памылковым. Якраз у выпадку ВКЛ вызначаная назва шляхты як нясучага слою ўказвае на якаснае адрозьненьне ад ‘natio’. Пасьля выміраньня Ягелёнаў па мужчынскай лініі ў 1572 г., увядзеньня выбарнай манархіі, а таксама, не ў апошнюю чаргу ў выніку ўсталяваньня рэальнай уніі з Польшчай, не ставала цэнтральнай фігуры, якая б была вылучаная зь мясцовай дынастыі ды ідэнтыфікавала *natio lituanica*. Нават фізычная прысутнасьць манархаў у Вялікім Княстве скарацілася пасьля 1569 г. — вялікакняскі двор асіраціў. Замест яго магнацкія рэзыдэнцыі пераанялі функцыі палітычных і культурных цэнтраў.

Праўда, пры больш блізкім разглядзе паняцьце шляхецкай нацыі аказваецца занадта схематычным, каб быць адэкватным складанай структуры грамадзтва. Фармальна гарантаванае раўнапраўе ў межах гэтага саслоўя зьяўлялася ў Вялікім Княстве яшчэ большай фікцыяй, чым у Кароне Польскай, з-за мацней выяўленай прасторавай дыфэрэнцыяцыі ды больш вялікіх сацыяльных кантрастаў. У палітычнай практыцы лёс краіны заўжды вызначала толькі малая колькасьць сем’яў, не ў апошнюю чаргу з дапамогаю разбудаванай сеткі кліентэлы — сыстэмы залежнасьці дробнай і сярэдняй шляхты ад магнатаў-патронаў. Гэтая сетка вельмі хутка пачала пашырацца па-за межы ВКЛ на Польшчу ды зьнітавала іх.

Фактычны посьпех Контррэфармацыі ўяўляецца як працэс, які, праўда, падзяліў высакароднае і невысакароднае насельніцтва, але працякаў паралельна ў абодвух слаях. Гэтаму папярэднічала фаза інтэнсіўных рэлігійных канфліктаў, якія, у адрозьненьне ад Захаду кантынэнту, толькі зрэдку прыводзілі да эскаляцыі гвалту. Паралельна з прасоўваньнем каталіцтва як у яго рымскім, так і грэцкім (уніяцкім) варыянтах польская мова прынцыпова выйгравала. Паралельна з прасоўваньнем пальшчызны ў прынцыпе выйгравала таксама беларуская мова, калі нават выключна як гутарковая мова. Літоўская ж, што выцясьнялася, знаходзіла сабе распаўсюджаньне ўсё больш у друку.

Моўная і рэлігійная мабілізацыя адбывалася пры гэтым не паралельна і ўжо зусім ня ўздоўж сучасных нацыянальных межаў. Пазьней непасрэдна да ўжываньня польскай мовы зьвярнуліся лідэры праваслаўя, якія карысталіся такой арганізацыйнай формай, як брацтвы, ды арыентаваліся разам з тым на іхны заходнецаркоўны прататып. Мадэль саслоўнага прадстаўніцтва ўрэшце ўплывала таксама на габрэйскае самакіраваньне, што, зь іншага боку, заставалася не без наступстваў для ідэнтыфікацыі гэтай групы насельніцтва зь Вялікім Княствам. Як і праваслаўныя гараджане, габрэі таксама паводле сусьветных узораў успрымаліся як элемэнт пануючага саслоўя.

Разам з тым, праца пацьвярджае тэзы больш новых дасьледаваньняў, што ў Рэчы Паспалітай пэўныя інстытуцыянальныя і культурныя ідэалы сталіся супольным здабыткам, не зважаючы на этнічныя ці канфэсійныя межы. Але як Вялікае Княства Літоўскае ў раньні Новы час нельга зводзіць да ролі прыдатку Польшчы, таксама было б спрашчэньнем і інтэрпрэтаваць яго гісторыю толькі як працэс заняпаду сярэднявечнай велічы, ці як перадгісторыю сучаснага нацыяналізму. З гэтага пастуляту Матыяса Ніндарфа можна зрабіць выснову, што сучасным літоўскім і беларускім тэарэтыкам нацыі трэба вельмі асьцярожна падыходзіць да інструмэнтальнага выкарыстаньня спадчыны Вялікага Княства. Гаварыць можна, хутчэй, сапраўды пра здабыткі.

# Пошукі Адольфа Янушкевіча

18 чэрвеня 1857 г. у Дзягільна, што недалёка ад Койданава, памёр Адольф Янушкевіч — паўстанец, дасьледчык, крэўны сваяк Касьцюшкі. Праз 150 гадоў гурт энтузіястаў вырашыў адшукаць яго магілу. Піша **Мікола Крывальцэвіч**.

За год да сваёй сьмерці Янушкевіч вярнуўся з выгнаньня. На чужыне, у Сібіры, а затым на Урале, куды Адольф быў высланы за ўдзел у паўстаньні 1830—31 г., ён пражыў 24 гады. Лёс зводзіў Янушкевіча зь Яхімам Лелевэлем, Юльюшам Славацкім, Антоніем Эдвардам Адынцом. Менавіта ён стаў адным з герояў паэмы «Дзяды» Адама Міцкевіча. Яму прысьвяціў тры свае «сібірскія» вершы расейскі паэт Аляксандар Адоеўскі. У яго гонар пісаў вершаваныя радкі Антоні Адынец…

## На Панскіх могілках

Старыя (Панскія) могілкі некалі знаходзіліся за ваколіцамі Дзягільна. Цяпер да таго ўзвышша каля рачулкі падступаюць хаты вяскоўцаў. Недалёка, на высокім беразе рэчкі стаяў маёнтак Янушкевічаў, ад якога захаваўся мураваны гаспадарчы будынак. На тых могілках у другой палове XIX ст. знайшлі апошні спачын многія з роду Янушкевічаў.

Тутэйшыя жыхары, мякка кажучы, ня лепшым чынам абышліся з пахаваньнямі шаноўных землякоў. За саветамі магільныя склепы ды пліты былі паніштаныя. Толькі калі ўважліва прыглядацца, сярод кустоўя можна дзе-нідзе пабачыць параскіданыя дробныя камяні ды макаўкі валуноў. Могілкі ў пасьляваенныя гады рабавалі тутэйшыя людзі. З надмагільных пліт атрымліваліся добрыя жорны ды падмуркі. Некаторыя камяні і дагэтуль ляжаць на падворках сялян. На адным зь іх можна прачытаць: Грыбоўскі Францішак, жыў 15 гадоў і памёр 20 кастрычніка 1875 г.

У хмызьняку знаходзіцца і груба апрацаваны камень невялікіх памераў, на баку якога прасочваецца надпіс. Ня ўсе літары і асобныя словы можна прачытаць. Тэкст напісаны кірыліцай па-беларуску: «Міхаіл Васілевіч Калеснік, Ж 79 1882 год». Верагодна, што камень быў усталяваны нашчадкамі ў 1920-я: каліграфія напісаньня нагадвае школьныя прапісныя літары. Навучаньне па-беларуску вялося тут у «беларусізацыю», альбо ў другую усясьветную вайну.

Ініцыятыва пошукаў пахаваньня Адольфа Янушкевіча належыць няўрымсьлівай Ганьне Матусевіч з Койданава ды яе палымянай дачцэ Вераніцы. Ганьне ўдалося сабраць нас у кастрычніку 2006 г. на колішніх Янушкевічавых кладах. Колькі дзён мы секлі хмызьняк, рэзалі дрэвы ды палілі сьмецьце.

Археалягічны пошук пачаўся пазьней. На месцы аднаго з паніштаных пахаваньняў, сярод цаглянага і каменнага друзу ўдалося раскапаць вялікіх памераў пліту з магілы Тэклі Янушкевіч. Пліта добра захавалася.

Тэкля з Сакалоўскіх Янушкевічава (1778—1860 г.), маці Адольфа, перажыла сына на тры гады. Яна была ўнучкай сястры Тадэвуша Касьцюшкі, Ганны. Менавіта маці Адольф напісаў з выгнаньня большасьць сваіх лістоў.

Недалёка ад рэштак яе магілы праглядалася вялікая западзіна — сьляды яшчэ аднаго паніштанага пахаваньня. Раскопкі на ім мы правялі ў лістападзе. У яме, на месцы разрабаванай магілы, куды вяскоўцы скідалі сьмецьце, быў знойдзены яшчэ адзін камень: «Міхаілу Янушкевічу. Нарадзіўся 17 ліпеня 1841г. Памёр 31 жніўня 1866 г.» На ўсю шырыню пліты, па літарах, нехта з вандалаў прасек глыбокую баразну, спрабуючы разьбіць камень на дзьве палавіны.


**Маці — Тэкля Янушкевіч.**

Міхаіл — пляменьнік Адольфа Янушкевіча, сын ягонага брата Януарыя і Марылі. Калі браты Адольфа Яўстах і Рамуальд вымушаныя былі пасьля паўстаньня 1830—31 г. эміграваць у Францыю, менавіта на Януарыі і яго маці засталася гаспадарка і маёнтак у Дзягільне. Ён і маці пасылалі Адольфу грошы, кніжкі ды адзеньне ў Сібір. Міхаіл быў адным зь пяцёх дзяцей Януарыя.

## Што вядома пра жыцьцё Адольфа Янушкевіча?

Адольф Міхал Валяр'ян Юльян Янушкевіч — сын Міхала Мерло Янушкевіча і Тэклі з Сакалоўскіх — нарадзіўся ў Нясьвіжы 28 траўня (9 чэрвеня) 1803 г. Дзяцінства Адольфа прайшло ў вёсцы Вусава каля Капыля, якой валодалі Янушкевічы. У 1821 г. яны прыдбалі вёску Дзягільна, што побач з Койданавам. Адольф вучыўся ў дамініканаў у Нясьвіжы, а затым быў узяты на Падольле на выхаваньне да дзядзькі Міхала Янушкевіча — былога ўдзельніка паўстаньня Касьцюшкі. Пасьля Адольф вучыўся ў Вінньіцкай гімназіі, у 1821 г. запісаўся на літаратурны факультэт Віленскага ўнівэрсытэту. Падчас вучобы ва ўнівэрсытэце быў блізкі да Таварыства філярэтаў.

У 1826 г. у Камянцы-Падольскім Адольфа Янушкевіча абралі дэпутатам Цывільнай палаты ў Галоўным судзе. У тым жа годзе памёр яго бацька. Празь нейкі час па стану свайго здароўя Адольф Янушкевіч змушаны быў пакінуць дэпутацкую пасаду ў Камянцы-Падольскім і ўвесну 1829 г. паехаць «на



**Адольф Янушкевіч.**

воды замежныя». У гэты час ён піша адзін са сваіх вершаў — санэт «Ад'езд» — для Стэфаніі Гіноўскай, якой прызнаваўся ў каханьні. Пазьней, калі Адольф апынуўся ў выгнаньні, Стэфанія імкнулася ехаць да яго ў Сібір, але той адгаворваў яе, хочучы для яе лепшай долі і шчасьця. Пасьля лячэньня ў Карлсбадзе Янушкевіч накіраваўся ў падарожжа па Эўропе. У Рыме ён сустракаўся зь Міцкевічам і Адынцом.

У верасьні 1830 г. Янушкевіч вярнуўся на радзіму. Яўхім Лялевэль паведаміў яму пра падрыхтоўку ў краі паўстаньня. Адольф едзе спачатку на Падольле, а затым у Вільню, Коўна, Варшаву. Ён актыўна ўключаецца ў падрыхтоўку, уваходзіць у аргкамітэт Легіёну Літвы, Валыні, Падольля і Ўкраіны. Янушкевіч быў прыхільнікам ідэй «маршу за Буг». Менавіта ён натхніў Юльюша Славацкага на напісаньне «Маршу Літоўскага Легіёну». А.Янушкевіч ахвяраў тысячу злотых на паўстаньне, а ад імя маці перадаў у паўстанцкую касу пярсьцёнак з брыльянтам. У сакавіку 1831 г. браў удзел у баях паўстанцаў каля Мацяёвіц у якасьці ад'ютанта кіраўніка легіёну, дзе быў моцна паранены (сем ран — рукі, нагі і галавы), упаў з каня і быў захоплены ў палон. Разам зь іншымі палоньнікамі яго павезьлі праз Берасьце, Маскву, Сімбірск да Вяткі.

Лялевэль, разумеючы важнасьць постаці Янушкевіча, рабіў захады па абмену яго на якога-небудзь палоннага расейскага вайскоўца. Зь Вяткі ў 1832 г. Янушкевіча пераслалі ў Кіеў пад суд. На допытах Адольф не раскайваўся, сьцьвярджаючы, што яго ўдзел у паўстаньні быў асэнсаваным выбарам. Янушкевіча прыгаварылі да сьмерці праз павешаньне, але пасьля павешаньне было замененае на пазбаўленьне шляхецтва, канфіскацыю і бестэрміновую высылку ў Сібір. Тэкля Янушкевіч — маці Адольфа — у лістах да цара прасіла памілаваньня для сына, спасылаючыся на яго хваробы і раны. Усе прашэньні адхіляліся Мікалаем I. У траўні 1832 г. Янушкевіча завезьлі ў Табольск.

У 1833 г. сярод высланых у Заходнюю Сібір сасьпела змова арганізаваць супольна з казахамі збройнае паўстаньне («*омский мятеж*»). Змоўшчыкі плянавалі сысьці ў Пэрсію альбо Індыю, а адтуль вярнуцца ў Эўропу. Іх пляны былі раскрытыя. Пасьля расправы над арганізатарамі, высыльных раскідалі па гарадах і вёсках Сібіры, аддаленых ад вялікіх трактаў. Янушкевіч апынуўся ў Ішыме.

У Ішыме адбываў пакараньне расейскі паэт і дзекабрыст Аляксандар Адоеўскі. Янушкевіч сустрэўся зь ім у 1836 г. Яны пасябравалі, Адоеўскі прысьвяціў Янушкевічу некалькі вершаў. Адольф падараваў яму кіпарысавую галінку, якую захоўваў ад часу падарожжаў па Італіі — з магілы Ляуры, прыгажосьць якой апяваў Пэтрарка.

У Ішыме Янушкевіч перакладаў «Гісторыю захопу Англіі нарманамі» францускага гісторыка Аўгуста Т'еры, пісаў лісты сябрам, у тым ліку Адаму Міцкевічу. З прысланых яму кніг стварыў бібліятэку для ссыльных.

У жніўні 1841 г. Янушкевіча перавялі ў Омск і дазволілі працаваць на дзяржаўнай службе, а ў студзені 1842 г. быў прыняты на працу ў Канцылярыю памежнага начальніка Сібірскіх кіргізаў (казахаў) і прызначаны сакратаром камітэту па стварэньні праекту казаскага права. Летам 1843 г. Янушкевіч накіроўваецца ў службовае падарожжа па стэпах, вывучаючы жыцьцё казахаў-качэўнікаў — народу, зямля і культура якога заставаліся ў той час малавядомымі для эўрапейцаў. У 1845 г. ён даехаў да мяжы Казахстану з Кітаем. У 1846 г. Янушкевіч удзельнічаў у расейскай місіі генэрала Мікалая Вішнеўскага, якая з Омску дайшла па стэпе да гор Алатаў і возера Алакол.

У час падарожжаў ён вёў дзёньнікі, у якіх дзень за днём цудоўнай літаратурнай мовай і дасканалым стылем апісваў свае назіраньні за жыцьцём казахаў. З запісаў паўстае вобраз тагачаснага казахскага грамадзтва, падпарадкаванага царскай Расеі. Янушкевіч шмат увагі зьвяртаў на казаскі фальклёр, паданьні, песьні, вершы, звычаі, сьвяты. Ён прарочыў вялікую будучыню казахам, цаніў іх паэтычнасьць, спачуваў ім. Захапленьне культурай народаў, якія яшчэ ня зьведалі ўплыву эўрапейскай цывілізацыі, заснувалася ў Янушкевіча на ідэях рамантызму. Адольф бачыў у казахах увасабленьне вольнага народу, не кранутага подыхам эўрапейскай цывілізацыі, сярод якога і ён пачуваўся свабодным чалавекам.

Дзёньнікі, лісты з падарожжаў па Казахстану былі выдадзеныя асобнымі кніжкамі ў Парыжы, а затым у Бэрліне (Żywot Adolfa Januszkiiewicza i jego Listy ze stepów kirgizkich. T.2. Paryż, 1861; Żywot Adolfa Januszkiiewicza i jego Listy ze stepów kirgizkich. Wydanie II, t.2. Berlin, 1875). Яны набылі вялікую папулярнасьць. Напрыклад, у 1863 г. Іван Тургенеў пісаў П.Аненкаву: «Спраўдзіце, калі ласка (гэта вельмі важна), ці не перакладаліся з польскай на расейскую мову ў якім-небудзь часопісе «Лісты з кіргіскіх стэпаў» Адольфа Янушкевіча».

У перакладзе на расейскую мову частка яго твораў выйшла ў Казахстане ў 1966 г. Казаскі пераклад быў зроблены Мукашам Серцекеевым у 1979 г.

Стан здароўя вымусіў Янушкевіча прасіць у жніўні 1849 г. звальненьня з Канцылярыі ў Омску. Адчуваючы сябе моцна хворым, ён займаецца домам, стварае ўсходні музэй і зьбірае матэрыялы падарожжаў па Казахстану.

У 1852 г. брат Адольфа, Яўстах, пазнаёміўся зь вядомым расейскім заводчыкам і паслом Анатолем Дзямідавым. Яўстах расказаў яму пра лёс Адольфа і прасіў дапамагчы. Дзямідаў дамогся пераводу А.Янушкевіча ў Ніжні Тагіл — інспэктарам саду ў рэзыдэнцыі Дзямідава і яго бібліятэкарам.

Янушкевіч хварэў на сухоты, прадчуваў хуткую сьмерць. Просьбы сяброў і родных аб вызваленьні не прыносілі посьпехаў. Тым больш што браты Яўстах і Рамуальд — актыўныя ўдзельнікі паўстаньня — знаходзіліся ў эміграцыі. Толькі ў красавіку 1856 г. Аляксандар II падпісаў указ аб амністыі і Янушкевіч змог вярнуцца ў Дзягільна да старой маці і брата Януарыя. Праз год, 18 чэрвеня 1857 г., Адольф Янушкевіч памёр.

Вядома, што пахаваньне Адольфа Янушкевіча месьцілася недалёка ад магілы яго маці. У бэрлінскім выданьні лістоў Янушкевіча цытуецца вершаваная эпітафія на магільным склепе Адольфа. Вядома, што яе тэкст стварыў Антоні Эдуард Адзінец. У ёй ёсьць такі радок: «… Бог ня меў слуг вярнейшых, край — больш годных сыноў». У прыпісе да эпітафіі можна было прачытаць наступны спадзеўны сказ да нашчадкаў: «Хоць і цярпеў пакуты перад вачыма людзкімі, аднак поўніцца надзея на яго бесьсьмяротнасьць».

Пошукі пахаваньня працягваюцца.

# Магіла льва на сьметніку

На Магілёўскім замчышчы будуюць праваслаўную царкву
Піша **Аляксей Бацюкоў**.




WWW.SVABODA.ORG

На ўваходзе вас сустрэне надпіс «Здесь строится православный храм. Относитесь к этому месту благоговейно». Вы ўсё яшчэ ня верыце, што за гэтай брамкай у студэнта, які фатаграфаваў катлаван, ляцелі камяні? Што журналіста тут здалі ў міліцыю за тое, што візытоўка ў яго аказалася на лацінцы («амэрыканскі шпіён»)? Што рэдактарку гарадзкой тэлевізіі абкладалі мацюкамі? Што археолягаў тут іначай як жыдамасонамі не называлі? Што грамадзкаму актывісту, які пачаў спасылацца на Эвангельле, адказалі: «Ідзі ты са сваім Эвангельлем»?

Вось бацюшка Андрэй на дне катлавану, у сіняй выцьвілай майцы калупае чорную пляміну зямлі. Зямля чорная, бо за Саветамі тут быў нужнік. А наверсе, філязафічна назіраючы за работай бацюшкі, стаяць прыхаджане, што былі здольныя і на камяні і на мацюкі. Рыдлёвак ім хапіла б, але нашто корпацца. Гэта тыя людзі, якія кіравалі зьнішчэньнем ладнай часткі культурнага слою на магілёўскім замчышчы. Магчыма, яны і фундатары, таму маюць дастаткова аўтарытэту, каб указваць бацюшку, калі пачне мірыцца бакі супрацьстаяньня, яго месца — «а хто ты нам такой?!»

Гэтая гісторыя пачалася ў 2002 г. Магілёўская япархія атрымала дазвол пабудаваць у цэнтральным гарадзкім парку храм пакутнікам і воінам, што загінулі за айчыну ў XX ст. Магілёўскі археоляг, доктар навук Ігар Марзалюк вёў раскопкі на меркаваным месцы забудовы — па пэрымэтры, вызначаным у праекце. Цягам тых жа гадоў хадзілі чуткі пра незадаволенасьць высокага гарадзкога начальства ідэяй мець замест цэнтральнага парку храм. Пры тым, што амбітны праект пабудовы самага высокага ў краіне праваслаўнага храму ў іншым раёне гораду так і не завяршыўся. Пасьля гучных знаходак сп.Марзалюка на замчышчы, якія на стагодзьдзе павялічылі ўзрост гораду, стала гуляць чутка пра таямнічую ініцыятыву замежных фундатараў пабудаваць на замчышчы замест храму музэй жывой археалёгіі з рэстарацыяй заадно.

Ня дзіўна, што некалькі тыдняў таму прыхаджане актывізаваліся і сабралі 13 тысяч подпісаў за тое, каб пабудаваць на замчышчы ўсё ж такі храм. А калі на абласной тэлевізіі акруглілі колькасьць подпісаў да дзесяці тысяч, прыхаджане тэлефанавалі рэдактарам і вінавацілі іх у жыдамасонскай змове.

19 чэрвеня каля парку, пабачылі машыны, якія вывозілі з тэрыторыі замчышча зямлю. Не папярэдзіўшы анікога, без нагляду археолягаў, прыход храму пачаў капаць катлаван пад будаўніцтва. Яго пэрымэтар быў значна большы за той, што раней дасьледавалі археолягі. Тоны зямлі з культурным слоем вывозіліся проста на сьметнік да Дняпра. Пра танальнасьць размоў прыхаджанаў з грамадзкімі актывістамі можна меркаваць па першым абзацы. Прыехала тэлевізія, І.Марзалюк паведаміў пра здарэньне ў Мінкульт, гарвыканкам, у пракуратуру. Работы спыніліся. Да заўтра.

У наступныя дні работы вяліся з такім разьлікам, каб сустрэць мінімум супраціву. Будаўнікі шчыравалі да ночы. На трэці дзень катлаван завяршылі, на чацьверты па пэрымэтры, які ахапіў ледзь ня дзьве трэціны парку, зьявіліся яміны для слупоў агароджы. Капалі іх вечарам, зноў жа, без нагляду археолягаў.

Сьцены катлавану — зараз ён глыбінёй ад 4,5 да 6 мэтраў — паказваюць археолягам, якую каштоўнасьць яны згубілі. Рысы культурнага слою акрэсьліваюць мяжу самага старога гарадзішча, засьведчыўшы, што ўжо ў X—XI ст. яно мела ўмацаваны вал і роў. Дагэтуль навукоўцы ведалі толькі абрысы пазьнейшай, насыпанай у пачатку XVI ст. пляцоўкі пад замак. Дасьледаваныя нармальна, гэтыя вал і роў далі б найкаштоўнейшую інфармацыю. А пакуль прыйдзецца задаволіцца кавалкамі керамікі, выкалупанымі са сьцен катлавану. Яшчэ археолягам застаецца спадзявацца, што яны іншымі раскопамі, побач з будоўляй, намацаюць тыя вал, роў, а мо і пасад, і гэта аўтаматычна пацьвердзіць, што Магілёў быў горадам на 200, 300 гадоў раней за 1267 г. Для Магілёва гэта азначае і тое, што ён нарэшце ўпішацца ў стандартную схему ўзьнікненьня гарадоў на беларускіх землях. Дагэтуль ён быў парадаксальна «маладым».

Але катлаван гатовы, зямля на сьметніку, і ў нядзелю адбылося першая служба на месцы новага храму. У адрозьненьне ад «рэстаўрацый» і будоўляў у Горадні, Менску, Віцебску, у Магілёве ўсё адбылося хутка, незваротна, і безь ніякай ініцыятывы ўладаў. Патрэбы й не было — пэўна, спэцыфічны статус праваслаўнай царквы ў Беларусі дазваляе некаторым яе адэптам разьбірацца з культурнымі каштоўнасьцямі самастойна.

Цяпер Ігар Марзалюк робіць на вольнай пакуль тэрыторыі парку накіды наступных раскопак і амаль штодня з памочнікамі перабірае горкі зямлі, вывезенай на сьметнік. Гэта пляцоўка плошчай у футбольнае поле, каб дасьледаваць яе ўсю, ня хопіць і году. Дый які сэнс — знаходкі маюць найбольшую карысьць у сваіх культурных слаях. Але работа ідзе — хто ведае, што за каштоўнасьць выкінулі на сьметнік цемрашалы.

# Адзін з дваццаці васьмі

Сёлета гісторыку **Міхасю Бічу** магло б споўніцца 70 гадоў. Піша **Алесь Смалянчук**.

Раптоўная сьмерць у 1999 годзе перарвала жыцьцё чалавека, які ў другой палове 80-х — пачатку 90-х быў адным з найбольш актыўных прыхільнікаў пераменаў у беларускай гістарычнай навуцы, непасрэдна прычыніўся да краху пракамуністычнай і прарасейскай трактоўкі беларускай мінуўшчыны, якая пазбаўляла беларусаў права на самастойную будучыню. Намесьнік дырэктара Інстытуту гісторыі Акадэміі Навук, прафэсар Міхась Біч узначальваў навуковы калектыў па распрацоўцы нацыянальнай канцэпцыі гісторыі Беларусі, якая перадвызначала асноўныя кірункі гістарычных дасьледаваньняў у 90-я.

Апошняя нашая сустрэча са спадаром Міхасём адбылася на пачатку траўня 1999 г. Размова ішла пра неабходнасьць напісаньня рэцэнзіі на школьныя падручнікі гісторыі Беларусі для 8 клясы. Апроч падручніка Міхася Біча (1997), напісанага ў межах нацыянальнага дыскурсу, у школьныя бібліятэкі паступіў падручнік Васіля Філімонава. Аўтар спрабаваў вярнуць у сыстэму школьнай гістарычнай адукацыі савецкія ідэалягемы. Гэтая тэндэнцыя моцна хвалявала Міхася Біча.

Ён быў актыўным удзельнікам тых «баёў за гісторыю», якія разгарнуліся ў Беларусі ў 90-я і працягваюцца да сёньня. Ён удзельнічаў у дыскусіях, абараняючы «беларускасьць» Кастуся Каліноўскага і Францішка Багушэвіча, якіх Уладзімер Казьбярук залічыў у «фальшывыя маякі і міражы» айчыннай гісторыі. Пратэставаў і спрачаўся з прафэсарам Валерыем Чарапіцам, прыхільнікам «заходнярускага» бачаньня беларускай гісторыі. Выкрываў павярхоўнасьць і нізкі навуковы ўзровень тэкстаў падручніка гісторыі Беларусі для студэнтаў ВНУ пад рэдакцыяй Яўгена Новіка і Георгія Марцуля (1998). Разам з дырэктарам Інстытуту Міхасём Касьцюком адказваў на «пагромныя» артыкулы-даносы прафэсара Пятра Петрыкава, які вінаваціў кіраўніцтва Беларускай энцыкляпэдыі і Інстытуту гісторыі ў «русафобіі».

Праблемы зь дзяржаўнымі ідэолягамі ды іх дублёрамі з навуковага асяродзьдзя ў Міхася Біча былі і раней.



**Міхась Біч у 60-я, калі толькі нараджаўся як навуковец.**

Ужо адна зь першых публікацый маладошага навуковага супрацоўніка Інстытуту гісторыі выклікала абурэньне партыйных кантралёраў. Малады дасьледчык у артыкуле «У змаганьні за лепшую долю (да 60-годзьдзя газэты «Наша доля»)» (Полымя. 1966, № 8) паказваў навуковую неабгрунтаванасьць ідэалягічных клішэ («рэакцыйнасьць», «буржуазны нацыяналізм», «здрада беларускаму народу» і г.д.), замацаваных за беларускім Адраджэньнем. Ня меншае абурэньне «гісторыкаў-прапагандыстаў» выклікалі публікацыі М.Біча, у якіх разглядалася месца і роля БУНДу ў рабочым руху Беларусі. Чуліся галасы, што аўтар ставіць пад сумнеў «марксісцка-ленінскую навуку пра гегемонію пралетарыяту». Але дасьледчык не саступіў. І ў тыя гады, і пазьней ён будзе праяўляць пасьлядоўную неталерантнасьць да прафэсійнай некампэтэнтнасьці калегаў.

У 1986 г. Міхась Біч быў адным з аўтараў «ліста дваццаці васьмі» да Генэральнага сакратара ЦК КПСС Міхаіла Гарбачова. Яго аўтары, прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі, упершыню ў савецкай пасьляваеннай гісторыі адкрыта выступілі ў абарону беларускай мовы і самой нацыі, якая ў выніку палітыкі савецкага «інтэрнацыяналізму» аказалася на мяжы духоўнай сьмерці. У лісьце прапаноўвалася ўвядзеньне беларускай мовы ў якасьці рабочай у партыйныя і дзяржаўныя органы ўлады.

Сёньня катастрафічна не хапае такіх людзей, як Біч.

Якраз адсутнасьць супраціву абярнулася фактычным зьнішчэньнем Інстытуту гісторыі АН як навуковай установы. Пазыцыя сучаснага кіраўніцтва Інстытуту (дырэктар праф. А.Каваленя) ня мае нічога супольнага з клопатам пра разьвіцьцё гістарычнай навукі. Гэта, хутчэй, клопат пра яе ліквідацыю. Многія дасьледчыкі, працы якіх сталі значным унёскам у беларускую гістарыяграфію рубяжа стагодзьдзяў, былі змушаныя пакінуць Інстытут. Як падаецца, сучасную адміністрацыю Інстытуту хвалюе ня столькі навуковая вартасьць працаў ягоных супрацоўнікаў, колькі іх палітычная пазыцыя.

…Ах, кампрамісы, кампрамісы —
Стратэгій тонкая гульня.
А ўжо душу халоднай пысай
Вынюхвае шпікоў гайня.

І ўжо ўсучыць лаўчыцца вораг
Свае паскудныя дары.
І ўжо сырэе гнеўны порах.
І ўжо тупеюць тапары.

А потым будзе кроў дыміцца,
Ударыць боты па касьцях…
Ах, кампрамісы, кампрамісы!..
І рукі выпускаюць сьцяг…

(Г.Бураўкін)

Зрэшты, гісторыя не заканчваецца сёньняшнім днём. Беларускія гісторыкі ведалі і больш цяжкія часы. Хочацца спадзявацца, што памяць пра такіх дасьледчыкаў, як Міхась Біч, будзе гарантыяй нармалізацыі беларускай навукі і вяртаньня навукоўцаў да сваіх непасрэдных абавязкаў, а менавіта да навуковага вывучэньня мінулага краіны і народу.

# Няма славы безь дзяржавы

Ёсіп Броз Ціта — вядомы і невядомы. Піша **Ўсяслаў Шатэрнік**.

Сёлета спаўняецца 115 год маршалу Югаславіі Ёсіпу Брозу Ціта. Няшмат знойдзецца ў гісторыі XX ст. асоб, пра якіх існавала б столькі ўзаемавыключальных меркаваньняў. Маршала параўноўвалі са Сталіным, Гітлерам, Мусаліні, Чэрчылем і дэ Голем. Яго абвяшчалі найлепшым сябрам СССР і самым небясьпечным ворагам камунізму. Югаслаўскага лідэра вінавацілі ў вялікасэрбскім шавінізьме і ў зьдзеках з сэрбаў. Кім жа быў Ёсіп Броз Ціта?

Будучы правадыр паўднёвых славян нарадзіўся ў 1892 г. на харвацка-славенскай мяжы. На той час гэта была Аўстра-Вугоршчына, і родная вёска Ёсіпа, Кумравец, знаходзілася акурат паміж аўстрыйскай і вугорскай часткамі імпэрыі.

Як і савецкія маршалы, Варашылаў і Блюхер, Ціта пачынаў як сьлюсар. У пошуках працы ён абышоў амаль усю імпэрыю. Галоўнай яго марай была эміграцыя ў Амэрыку, каб стаць *«самым вялікім капіталістам»*.

З пачаткам Першай Сусьветнай вайны маладога харвата бяруць у аўстрыйскае войска. Там ён выяўляе сябе як храбры і аддады імпэратару салдат. Ідэі славянскага адзінства ці пралетарскага братэрства яго ідавочна не хвалююць. Нават трапіўшы ў расейскі палон, Ёсіп не сьпяшаецца далучыцца да братоў-славян. Ціта вызваліла Кастрычніцкая рэвалюцыя. Вярнуўшыся на Радзіму, ён далучаецца да толькі што створанай югаслаўскай кампартыі.

У наноў створаным Каралеўстве Сэрбаў, Харватаў і Славенцаў было неспакойна. У каталіцкіх Харватыі і Славеніі былі незадаволеныя ўладай праваслаўных сэрбаў. Чарнагорцы не мірыліся са стратай дзяржаўнасьці. Альбанцам і македонцам забаранялася нават сьпяваць песьні на сваёй мове. Усё гэта стварала спрыяльныя ўмовы для дзейнасьці рознага кшталту радыкалаў, да якіх належаў і Ёсіп Броз. З 1937 г. ён — кіраўнік кампартыі. Новаму генсеку даручаюць пераклад «Кароткага курсу ВКП(б)» — галоўнай кнігі камуністаў тых часоў. Гэта сьведчыла, з аднаго боку, пра безумоўны давер цэнтру. А зь іншага боку пра тое, што асабліва важных задач Масква югаслаўскім камуністам не давала, ня верачы ў іх сілу.

Становішча зьмянілася з пачаткам вайны. У красавіку 1941 г. Югаславія была акупаваная і падзеленая паміж Нямеччынай і яе хаўрусьнікамі — Баўгарыяй, Вугоршчынай, Італіяй. Акупанты ўсталявалі бязьлітасны рэжым, расстрэльваючы сотню мясцовых за аднаго свайго. Але самымі страшэннымі былі ўнутраныя разборкі. Асабліва жудасным быў тэрор, разьвязаны харвацкімі калябарантамі-ўсташамі супраць сэрбаў, габрэяў і цыган. У адным толькі канцлягеры «Ясеновац» на тэрыторыі Харватыі загінула сто тысяч чалавек. Сэрбскія нацыяналісты-чэтнікі вынішчылі ў адказ харватаў і мусульман. Камуністы аказаліся адзінай сілай, якая стаяла над традыцыйнымі канфліктамі і вяла рэальную барацьбу з захопнікамі. Пад іх кіраўніцтвам ствараецца партызанская Народна-вызваленчая армія Югаславіі на чале зь Ціта.

Імя Ціта набывае вядомасьць. Беларусы склалі прыпеўку: «*Танцавалі два бандыты: адзін Сталін — другі Ціта*». Галівуд стварыў фільм пра кіраўніка югаслаўскіх партызан. Самі немцы былі вымушаныя весьці зь ім перамовы.

У 1945 г. з дапамогай савецкіх войскаў партызаны занялі Бялград, была ліквідаваная ўстаская НХД (Незалежная Харвацкая Дзяржава). Да канца 1946 г. антыкамуністычны супраціў перастаў існаваць.

Цяпер Ціта мог заявіць аб сваіх замежнапалітычных амбіцыях. А яны былі немалыя: *«Удзельнічаць у вырашэньні лёсаў Эўропы»*. Ня больш — ня менш. Гэта азначала прэтэнзіі на населеныя славенцамі аўстрыйскія і італьянскія землі, у тым ліку на Трыест.

У 1946—48 г. Ціта лічыўся галоўным ворагам на Захадзе і першым сябрам у СССР. Рэзалюцыя Інфармбюро, што абвясьціла Ціта ворагам камунізму, стала для ўсіх шокам.

І па сёньняшні дзень шмат хто ня можа зразумець, чаму пасварыліся два Язэпы — Сталін і Ціта.

Супярэчнасьці існавалі даўно. Масква была незадаволеная нежаданьнем Ціта ісьці на кампраміс з Захадам там, дзе гэтага хацелася Сталіну, узгадняць з цэнтрам пляны эканамічнага разьвіцьця. Югаслаўскія камуністы былі пакрыўджаныя на Маскву за позьняе прызнаньне (першапачаткова ў Крамлі стаўка рабілася на лідэра чэтнікаў Дражэ Міхайлавіча), нерэгулярную дапамогу ў час вайны. Далёка не гарманічна склаліся адносіны паміж братамі-славянамі і Чырвонай Арміяй. Апошняй кропляй стаў праект так званай Балканскай фэдэрацыі. Паводле пляну Масквы, Югаславія павінна была ўзяць частку донарскіх функцый у дачыненьні да братоў па сацыялістычным лягеры. У югаславаў былі іншыя пляны. Яны марылі аб новых тэрыторыях. Найбольшую цікавасьць традыцыйна выклікала Альбанія.

Альбанская кампартыя была створаная эмісарамі Ціта. Лідэры Энвэр Ходжа і Коча Дзодзэ па сутнасьці былі цітаўскімі пратэжэ і разгарнулі ў краіне барацьбу з *«антыюгаслаўскай дзейнасьцю»*. Гэтага, аднак, аказалася недастаткова, і Бялград пачаў уводзіць у суседнюю краіну войскі. Сталін быў незадаволены. Грубыя дзеяньні цітаўцаў пагражалі выклікаць новы балканскі канфлікт, што ставіла пад сумнеў трываласьць сацыялістычнага лягеру. З Масквы пайшлі загады — *«узяць Альбанію розумам»*.

У югаслаўскім палітбюро пачалі адкрыта казаць, што ў СССР пануе вялікадзяржаўны шавінізм. Усё гэта ішло Сталіну на стол са стандартнымі высновамі: «*заселі шпіёны», «трацкісцкія настроі»*. Але і ў Бялградзе не драмалі. Інфарматары Масквы былі выяўленыя і арыштаваныя. Так на сьвет зьявілася рэзалюцыя пра *«цітаўскую кліку забойцаў»*.

«Кліку Ціта» абвінавачвалі ў вялікасэрбскім шавінізьме. Само прыняцьце рэзалюцыі Інфармбюро было прымеркаванае да гадавіны памятнай для сэрбаў Косаўскай бітвы. Сэрбаў абвінавачвалі ў чорнай няўдзячнасьці



Расеі, бязглуздай упартасьці, дзікасьці. Набор гэтых абвінавачаньняў сабраны ў кнізе Арэста Мальцава «Югаслаўская трагедыя». На беларускую мову гэтага сталінскага ляўрэата пераклаў Алесь Стаховіч.

Альбанцы, наадварот, лічыліся найбліжэйшымі сябрамі СССР. Э.Ходжа пераарыентаваўся, расстраляўшы Кочу Дзодзэ як югаслаўскага шпіёна. Пры нявысьветленых абставінах памёр у Маскве сябар Ціта, баўгарскі прэм'ер Георгі Дзімітраў. Любая нязгода з Масквой, сувязі зь югаславамі пачалі клясыфікавацца як «цітаізм».

У «братніх» краінах Усходняй Эўропы пачалі выяўляць цітаўцаў. Пошук не абмінуў і БССР. У 1954 г. па абвінавачаньні ў цітаізьме быў арыштаваны міністар адукацыі Пётар Савеіч.

Пачалі распрацоўвацца пляны ліквідацыі Ціта. Далікатную місію даручылі прафэсійнаму тэрарысту Ёсіфу Грыгулевічу, у мінулым сябру Таварыства беларускай школы, таварышу Максіма Танка па Лукішках. Грыгулевіч павінен быў трапіць у рэзыдэнцыю Ціта і заразіць ворагаў лёгачнай чумой. Толькі сьмерць Сталіна перашкодзіла рэалізацыі бактэрыялягічнага тэрарызму.

У Югаславіі ж пачалі вышукваць так званых «інфармбюроўцаў», тых, каго падазравалі ў сымпатыі да СССР. Для іх быў створаны адмысловы канцлягер «Голы Отак». Туды трапіла шмат партызанскіх герояў. Назву цітаўскіх спэцслужбаў УДБ расшыфроўвалі як *«убі друга бліжняга»*.

Канфлікт са Сталіным прымусіў Ціта перагледзець пляны будаўніцтва сацыялізму. Ад калектывізацыі адмовіліся, на прадпрыемствах было ўведзена «рабочае самакіраваньне», спыніўся ціск на рэлігію. У Югаславіі можна было бачыць усё — ад абстрактнага мастацтва да парнаграфіі. Для савецкіх турыстаў яна была спажывецкім раем. Для левых інтэлектуалаў — «сацыялізмам з чалавечым тварам», для лідэраў «трэцяга сьвету» — узорам удалага балянсаваньня паміж сацыялістычным Усходам і капіталістычным Захадам.

Ціта карыстаўся павагай у сьвеце і вёў жыцьцё гурмана. Аматар аўтамабіляў, шыкоўных строяў, яхтаў. Такім паўстае Ціта ў апошнія гады. Аднак, як і ўсе дыктатары, пад канец жыцьця ён рабіўся ўсё больш адзінокім. Сыходзілі паплечнікі. Галоўны прапагандыст Мілаван Джылас быў адхілены за *«празьмерную дэцэнтралізацыю»*. Начальнік УДБ Аляксандар Ранковіч — за *«празьмерную цэнтралізацыю»*.

Апошняя жонка Ціта (афіцыйна ён быў жанаты тройчы) Ёвонка Будславіч трапіла пад хатні арышт. Прычыны мужавай няміласьці дакладна не вядомыя, калі не лічыць кінутай аднойчы фразы: *«Не люблю жанчын, якія ўмешваюцца ў палітыку»*.

Галоўную мэту Ціта бачыў у захаваньні югаслаўскага адзінства. *«Кожная з нашых рэспублік сама па сабе нічога не ўяўляе... Толькі разам»*, — казаў маршал. Аднак адзінства не выходзіла. Славенцы, харваты лічылі сябе эўрапейцамі і з пагардай глядзелі на басьнійскіх, македонскіх, касаўскіх сялян, якіх называлі «бізантыйцамі». У Харватыі былі незадаволеныя непрызнаньнем сваёй мовы. У Сэрбіі — ігнараваньнем гісторыі Сэрбскага каралеўства. Штучным называлі вылучэньне басьнійскіх мусульман у асобны народ. Тлела рэлігійная варажнеча.

Яднала краіну постаць Ціта і савецкая пагроза. Нягледзячы на афіцыйнае прымірэньне, з Масквы пастаянна ішлі намёкі на «інтэрнацыянальную дапамогу».

Сьмерць Ціта 4-га траўня 1980 г. пазбавіла Югаславію лідэра. А «перабудова» — вялікіх крэдытаў з Захаду. Пачалі прасьвятляцца «цёмныя плямы» цітаўскага жыцьцяпісу: удзел у сталінскіх чыстках 30-х, перамовы зь немцамі, «Голы Отак».

У Сэрбіі маршала сталі называць сэрбскім катам, параўноўваць з усташамі. У Харватыі пайшлі чуткі, што Ціта зусім не харват Ёсіп Броз, а савецкі парашутыст. Цітаўская спадчына адкідалася, у тым ліку і ўсталяваныя ім рэспубліканскія межы. Вынікі добра вядомыя.

На сёньняшні дзень Ціта найбольш шануюць у Босьніі. Цітаўская эпоха для басьнійцаў — гэта часы, калі суседзяў не забівалі з-за рэлігіі ці розьніцы ў гаворцы. У Харватыі і Славеніі Ціта згадваюць як славутага земляка. Магілу маршала ў Бялградзе наведваюць толькі сваякі і партызаны-вэтэраны.

Лёс Ёсіпа Броза Ціта пацьвярджае слушнасьць слоў, сказаных некалі Цыцэронам Юлію Цэзару: *«Вялікая слава твая, але калі ня будзе гораду Рыму, будзе яна толькі рэхам»*.

# У Брне месяц будзе гучаць беларуская мова

Трыццаць беларускіх літаратараў будуць гасьцямі найбуйнейшага чэскага літаратурнага фэстывалю «Месяц аўтарскага чытаньня».

«Месяц аўтарскага чытаньня» — найбуйнейшы чэскі літаратурны фэстываль, які з 2000 году ладзіць выдавецтва й агенцтва «Větrné mlýny» («Ветракі»). Адбываецца ў часе тэатральных вакацыяў, штодня зь 1 да 31 ліпеня, у памяшканьні тэатру «Husa na provázku» («Гусь на канаце»).

У 2000—2004 гадах праграма фэстывалю ўключала адну літаратурную вечарыну штодня на працягу ліпеня.

Зь 2005 году колькасьць вечарынаў падвоілася: адна — прысьвечаная чэскай літаратуры, другая — прэзэнтуе творцу з краіны — ганаровага госьця фэстывалю.

У 2005 годзе такімі ганаровымі гасьцямі былі славацкія пісьменьнікі, у 2006-м – нямецкія, сёлета гасьцямі фэстывалю будуць літаратары зь Беларусі.

Распачнуць фэстываль Уладзімер Арлоў ды Богдан Трояк, а завершаць Андрэй Хадановіч ды Іван Краўс. Сярод беларускіх удзельнікаў «МАЧ» – Лявон Вольскі, Алесь Разанаў, Ева Вежнавец, Наталка Бабіна, Вера ды Віктар Жыбулі, Ігар Бабкоў.

Акрамя клясыкаў літаратуры на фэстывалі можна будзе пабачыць навінкі тэатральнага пэрформансу. Упершыню ў гісторыі фэстывалю Летняя кінэматаграфічная школа ва Ўгорскім Градзішчы прадставіць агляд незалежнага кіно ў цэнтры Брна.

Для прыежджых наведнікаў арганізатары прапануюць пасярэдніцтва ў пошуку і рэзэрвацыі пражываньня. Журналістам прадастаўляецца акрэдытацыя і ўсялякая дапамога.

Плата за ўваход на ўсе імпрэзы фэсту — добраахвотная. Адмыслова да фэстывалю падрыхтавалі праграмны каталёг, у якім можна знайсьці асноўную інфармацыю пра кожнага з удзельнікаў.

Для тых, хто ня зможа патрапіць у ліпені ў Чэхію: вечарыны «МАЧ» можна будзе глядзець у Інтэрнэце на старонцы on-line www.autorskecteni.cz/by/. На гэтай старонцы можна знайсьці таксама неабходныя адрэсы і кантакты арганізатараў.

**Сямён Печанко**

КАЛЯНДАР

## Ліпень

**3** — Дзень вызваленьня Менску ад нацыстаў (1944).

**4** — Дзень Незалежнасьці ЗША.

**7** — Іван у праваслаўных.

**7** — 125 гадоў з дня нараджэньня народнага паэта Беларусі Янкі Купалы (1882—1942).

**9** — 650 гадоў таму (1357) у Празе закладзены Карлаў мост.

**11** — 75 год з дня нараджэньня Анатоля Анікейчыка (1932 – 1989), скульптара, пэдагога, народнага мастака Беларусі. Найбольш вядомыя працы – помнік Купалу і фантан «Купалінкі» ў парку імя Янкі Купалы, а таксама бюст паэта ў Араў-парку ў Нью-Ёрку.

**12** — Сьвятыя Пятро і Павал у праваслаўных.

**15** — Дзень Грунвальдзкае бітвы.

**22** — Міжнароднае матэматычнае сьвята «дзень лічбы Пі».

**27** — Дзень прыняцьця Дэклярацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце Рэспублікі Беларусь (1990).

# У Віцебску адбудуюць дом Шагала і гатэль Бэлы




У Віцебску на вуліцы Пакроўскай, побач з музеем Шагала, будзе пабудаваны лёзненскі дом ягонага дзядзькі Зусмана, які маляваў геніяльны мастак. Карціна Марка Шагала «Дом у Лёзне» (1914 год) стала асновай для працы праекціроўшчыкаў. Даследчыкі перыядычна ўступаюць у спрэчкі: мо, менавіта тут нарадзіўся Шагал?

— А чаму ня ў Лёзьне? — пацікавіўся карэспандэнт «Звязды» ў дырэктаркі музэю Людмілы Хмяльніцкай.

— У Лёзне не засталося старой забудовы, дый канкрэтнае месца знаходжаньня дому дзядзькі Зусі, як называлі яго сваякі, ня высьветлена. А вось на Пакроўскай, побач з музэем Шагала, — пустое месца. Хацелася б аднавіць атмасфэру вуліцы, будынкі часу Майстра. Дом дзядзькі — тыповы па сваёй забудове для Віцебску: першы паверх цагляны, а другі — драўляны.

У будынку адкрыюцца цырульня, кафэ, міні-гатэль. Будаўніцтва зойме два гады.

120-годзьдзе з дня нараджэньня Шагала адсьвяткуюць 07.07.2007. Шагал, які нарадзіўся ў адзін дзень з Купалам, ганарыўся мноствам «7» у сваёй даце.

Яшчэ ў Віцебску адновяць на гістарычным месцы гатэль «Брозі», дзе жыла сям'я жонкі Шагала Бэлы. Яе бацька на першым паверсе арандаваў памяшканьне для крамы гадзіньнікаў і ювэлірных вырабаў…

**Аляксандр Пукшанскі, «Звязда»**

**Старшыня Каларадзенка, абрабаваўшы калгас, рыхтаваўся да ўцёкаў. Але тут зьявіўся Бульбман — змагар зь несправядлівасьцю...**




МАЛЯВАЎ ЛЯВОН ВОЛЬСКІ

# Паэзія, якую бачаць

Экспазыцыя, прысьвечаная творчасьці Рыгора Барадуліна, працягвае працу на сядзібе БНФ. На выставе экспануюцца творы з 13-га мастацкага плэнэру імя Я. Драздовіча, які штогод праходзіць на Віцебшчыне.

Важнае месца ў творах мастакоў займае партрэтны жанр, прадстаўлены рознымі па настроі ды плястыцы алейнымі і акварэльнымі партрэтамі Р.Барадуліна ў выкананьні В.Крука, Ул.Сулкоўскага, А.Скаварады, А.Шыёнка.

Значная роля нададзена пэйзажу. Побач з натурна дакладнымі пэйзажамі А.Шыёнка знаходзім эпічныя кампазыцыі В.Крука і М.Таранды, лірычныя краявіды Я.РExternal манoўскага, рамантычны жывапіс І. Марачкіна, таямнічыя акварэлі А.Карпана. Уражвае інсталяцыя «Памяць матуль», якая спалучае элемэнты сымбалізму й постмадэрну.

Культурна-асьветніцкім цэнтрам імя Язэпа Драздовіча, творчымі суполкамі «Пагоня»і «Віцебская акварэль» па выніках плэнэру выдадзены каталёг.

**Эла Оліна**

## ЭКСПЭДЫЦЫЯ

**Раскопкі пад Адрубамі**

**30 ліпеня — 12 жніўня ў Сьветлагорску** арганізуецца моладзевая археалягічная экспэдыцыя. Месца раскопак — **каля вёскі Адрубы Кабанаўскага сельсавету** (Жлобінскі р-н). Экспэдыцыю ладзіць Таварыства беларускай мовы. Раскопкамі кіруе навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Акадэміі навук. **Прыём заявак на ўдзел — да 15 ліпеня.** Даведкі па т.: (02342) 3-43-12 (Вадзім Богдан),(029) 709-04-33 (Андрэй Музычэнка), e-mail: ekspedycyja@tut.by. Падрабязная інфармацыя: http://svetlahorsk.belarda.org/info/abviestki

## КАНЦЭРТ

**Океан Ельзи**

**1 ліпеня ў аэрапорце «Менск-1»** адбудзецца рок-фэстываль з удзелам гурту «Океан Ельзи». **Пачатак а 19-й.** Квіткі: 640-61-06 і (017) 256 17 76.

## ТЭАТАР

**Купалаўскі тэатар**

**29 (пт), 30 (сб)** — «Чорная панна Нясьвіжа».

*малая сцэна*

**29 (пт)** — «Востраў Сахалін».

**30 (сб)** — «Варшаўская мэлёдыя».

## ІМПРЭЗЫ

**За незалежную Беларусь**

**1 ліпеня ў Менску** адбудзецца фізкультурна-спартовае сьвята (пр.Пераможцаў). **Пачнецца яно а 9-й** з лыжаролерных забегаў. **Каля Палаца спорту** адбудуцца выступы асілкаў, вершнікаў, гімнастаў, футбалістаў і, магчыма, хакеістаў і фігурыстаў.

**3 ліпеня аб 11-й ля стэлы «Менск — горад-герой»** пройдзе вайсковы парад, а пасьля яго — сьвяточнае спартова-моладзевае шэсьце. **Увечары ў раёне абэліску** пройдзе заключны галя-канцэрт акцыі «За незалежную Беларусь». **Пачатак а 21-й. А 23-й — салют.**

**«Грушавы бальзам у Машэкі»**

**29 чэрвеня а 18-й у Магілёве** пачнецца вечарына — прэзэнтацыя кнігі С.Балахонава «Імя грушы». У праграме: выступ, чытаньні і сьпевы Сяргея Балахонава, сьпевы барда Андрэя Мельнікава, сцэнка «Гутарка двух гангстэраў», дыскусія па праблемах сучаснай культуры, конкурс для гледачоў. Інфармацыю аб месцы правядзеньня імпрэзы можна атрымаць па т.: (0232) 24-03-36; 388-35-61 (Алег) і на сайце mahilou.org. Уваход вольны.

## ВЫСТАВЫ

**Рамантыка вобразу**

**Да 23 ліпеня ў мастацкім музэі** адбываецца выстава твораў Анатоля Анікейчыка (1932—1989) «Рамантыка вобразу». Яна знаёміць пераважна з станкавымі творамі скульптара. **Вечар памяці**, прымеркаваны да 75-годзьдзя мастака, адбудзецца **11 ліпеня а 17-й**.

**Мой Менск**

**У галерэі візуальных мастацтваў NOVA** (Веры Харужай, 16) **да 20 ліпеня** працуе выніковая фотавыстава конкурсу «Мой Менск».

**Дзень гораду**

**Да 10 ліпеня ў М-Галерэі Інстытута імя Гётэ** (Фрунзэ, 5) працуе выстава фатаздымкаў Вадзіма Качана «Дзень гораду».

# Прэзэнтацыя «Начной чытанкі»

Радыё «Свабода» выдала мультымэдыйны дыск «Начная чытанка». На ім — запісаныя ў рамках праграмы «Начная Свабода» творы паўсотні аўтараў разам зь іх біяграфіямі і фатаздымкамі.

У зборніку — рэчы на любы густ і розных жанраў. Лявон Вольскі і Адам Глёбус чыталі свае казкі, Віктар Шалкевіч — міні-п’есы, Альгерд Бахарэвіч, Ева Вежнавец і Югася Каляда — апавяданьні. Сяржук Мядзьведзеў чытаў урыўкі з пакуль ненадрукаванай па-беларуску кнігі амэрыканца Чака Паланюка «Байцоўскі клюб».




А найбольш у «Начной чытанцы» паэзіі — свае вершы чыталі Рыгор Барадулін, Уладзімер Някляеў, Алесь Разанаў, Міхал Анемпадыстаў, Джэці, Віктар Жыбуль, Андрэй Хадановіч.

Прэзэнтацыі дыску — 28 і 29 чэрвеня ў фальварку «Добрыя мысьлі» (вул. Магілёўская, 12). Пачатак а 19-й. Колькасьць месцаў абмежаваная, на прэзэнтацыю трапяць тыя, хто прыйдзе першым. Дыскі змогуць атрымаць таксама і тыя, каму месца ня хопіць. Пазьней яго можна будзе замовіць праз электронны адрас nsvaboda@tut.by.

## КІНО

# Лаві хвалю

**Лаві хвалю** (Surf’s Up)

ЗША, 2007, каляровы, 85 хв.

**Рэжысэры:** Эш Брэнан, Крыс Бак

**Жанр:** анімацыйная камэдыя

**Адзнака:** 6 (зь 10)

Пінгвіня Кодзі марыць стаць слынным сэрфінгістам, як найлепшы сэрфэр усіх



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Што будзе ў Будзе

Праграма фэсту

**1 ліпеня**

**Ад 14.00** — сустрэча і прывітаньне пілігрымаў

**16.00** — сустрэча міжнароднай воднай пілігрымкі і гістарычнага крыжа.

**17.00** — сьв. Імша (служаць айцы бэрнардыны).

**18.00** — сьв. Імша для пілігрымаў зь Віцебскай дыяцэзіі (служыць біскуп Казімір Вялікаселец; сьпеў — пілігрымы).

**20.00** — сьв. Імша для пілігрымаў зь Менска-Магілёўскай архідыяцэзіі (сьпеў — пілігрымы).

**22.00** — Нешпары пра Найсьвяцейшую Панну Марыю

**23.00** — Акафіст Найсьвяцейшай Паньне Марыі (сьпеў — хор Грэка-Каталіцкай Царквы).

**2 ліпеня**

**0.00** — працэсія са сьвечкамі і ўрачыстая сьв. Імша (служыць біскуп Уладзіслаў Блін; сьпеў — хор «Залатая Горка»).

**Ад 2.00** — моладзевае малітоўнае чуваньне (пляц перад базылікай).

**2.00** — Боская літургія паводле ўсходняга абраду (перад абразом Маці Божай).

**4.00** — адарацыя Найсьвяцейшага Сакрамэнту (у базыліцы).

**5.30** — «Гадзінкі» да Маці Божай.

**6.00** — сьв.Імша (перад абразом Маці Божай).

**7.00** — сьвяты Ружанец.

**8.00** — сьв. Імша (служаць новапрэзьбітары; сьпеў — хор «Polonez»).

**10.30** — выстаўленьне Найсьвяцейшага Сакрамэнту, літанія да Маці Божай, працэсія, багаслаўленьне Найсьвяцейшым Сакрамэнтам.

**12.00** — урачыстая сьв.Імша (служаць каталіцкія біскупы Беларусі разам з Апостальскім Нунцыем арцыбіскупам Марцінам Відавічам; сьпеў — хор «Gloria»). На заканчэньне Імшы — гімн Te Deum.

Інфармацыю пра Санктуарый Маці Божай Будслаўскай можна знайсьці на старонцы http://budslau.catholic.by

Т.: (01797) 3-13-73,
**e-mail**: budslau@catholic.by
http://www.catholic.by

## НА ВЫХОДНЫЯ

часоў Вялікі Зі. І героя адбіраюць на кубак памяці Вялікага Зі. Недарэка Кодзі навучыцца перамагаць, але й зразумее, што сяброўства важнейшае за любыя прызы...

Анімацыйная камэдыя для сямейнага прагляду створаная як спартовы рэпартаж з закадравымі пытаньнямі, лёгкай камэрай і подпісамі: «Марскі вожык Іван, пінгвіня Кодзі, чэмпіён сьвету па сэрфінгу Танк». Кампутарныя жывёлкі даюць інтэрвію, глыбакадумна закатваюць вочы, а ў подпісах пазначаюцца пінгвіновыя тытулы...

У «рэпартажы» зьдзіўляе неверагодная прамалёўка дэталяў: марскія хвалі выглядаюць сапраўднымі, камэра дрыгаецца, хроніка быццам узятая з тэлевізіі.

Грымасы птушак, кальмараў, зьвяроў пацешныя й жывыя. Кожны пэрсанаж стужкі — ад галоўнага героя да другаплянавага пінгвіняці — мае свой непаўторны характар.

Акрамя «рэпартажнай дакумэнтальнасьці» амэрыканская карціна вабіць ненавязьлівым пасылам: «змагайся за перамогу, але сяброўства важнейшае за любыя прызы».

Добры адпачынак для ўсёй сям'і.

**Андрэй Расінскі**




# ГІСТОРЫЯ Ў «НН»

Чэрвень 2007


Археоляг адкапаў Полацак князя Рагвалода ........ 19

**Аляксандар Каўбаска.** Гісторыя ў ЭГУ: ўсё, што вы хацелі ведаць ........ 19

**Алег Дзярновіч.** Адсутнае зьвяно. Нямецкая кніга пра ВКЛ ........ 20

**Мікола Крывальцэвіч.** Пошукі Адольфа Янушкевіча ........ 22

**Аляксей Бацюкоў.** Магіла льва на сьметніку ........ 24

**Алесь Смалянчук.** Адзін з дваццаці васьмі. Памяці Міхася Біча ........ 25

**Усяслаў Шатэрнік.** Няма славы безь дзяржавы. Ёсіп Броз Ціта ........ 26


## КАЛІ Б...

**...сьвяткаваньне 3 ліпеня праходзіла адпаведна ўстаноўкам аб тым, што ўсё мае быць рэнтабэльна.**



МАЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

— Мне, калі ласка, адзін білет на трыбуну для назіральнікаў параду, на месца галоўнакамандуючага. А льготы, прабачце, няма?

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Маёрэнгоф. Васілю Васільку.** У кожным нумары даводзіць, што «ня сорам звацца беларусам», што мова наша «ня простая» — было бы залішне. Пішэце аб чым-колечы больш жывым.

**«Наша Ніва». №24. 1907**

## ВОЛЬНЫ ЧАС

**ГМКГА «Талака»** запрашае гомельцаў прыняць удзел у сьвяткаваньні Купальля ў ноч з 6 на 7 ліпеня. Гэтаксама шукаем на сьвята дудара з дудой. Т.: 341-66-94. Іншыя матэрыялы рубрыкі — **старонка 30**.





# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 17.**


## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### БЕЛАРУСКАМОЎНЫЯ ШПАЦЫРЫ

**Ад 18 гадзінаў штočацьвер** у Віцебску беларускамоўныя шпацыры ў навакольлі Дабравешчанскай царквы. Калі ласка, шпацыруйце на здароўе ды гаварыце па-беларуску, колькі душа просіць!

### ПАДАРОЖЖЫ

**Зьміцер Касьпяровіч запрашае** ў падарожжа 8 ліпеня (нядзеля) па маршруце: Менск — Мінойты — Бердаўка — Ліда — Крупава — Нецеч — Белагруда — Тарнава — Вавёрка — Менск. 13—16 ліпеня: Грунвальд — Мальбарк — Гданьск. Т:. 292-54-58; GSM 622-57-20, 509-12-16, 110-19-28


# Наша Ніва

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| шэф-рэдактар | Андрэй Дынько |
| галоўны рэдактар | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| заснавальнік | Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва» |
| выдавец | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |



**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.


12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 27.06.2007.

Замова № 3493.

Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.